ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПЯТНІЦА, 23 ВЕРАСНЯ 1938 г. № 52 (394)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Ленінская тэорыя социялістычнай рэволюцыі

Кароткі курс гісторыі ВКП(б), адобраны ЦК ВКП(б), прыкоўвае да сябе ўвагу ўсіх большэвікоў, партыйных і непартыйных. Ва ўсёй гістарычнай паўнаце і шматстайнасці перад чытачамі разгорнуты геранчныя старонкі барацьбы большэвіцкай партыі за падрыхтоўку дыктатуры пролетарыята.

Сёння «Правда» публікуе пяты і шосты раздзелы, якія ахватваюць перыяд уздыму рабочага руху 1912 — 1914 гг. і перыяд імперыялістычнай вайны і другой рэволюцыі ў Расіі. Перад чытачом праходзіць яркая, незабыўная карціна дзейнасці большэвікоў-праўдзістаў у 1912—1914 гг., у перыяд нарастання новай рэволюцыйнай хвалі. За гэтыя годы разам з «Правдой» — дзецішчам Леніна і Сталіна — і вакол яе выраслі і загартаваліся дзесяткі тысяч большэвікоў — рабочых, якія вытрымалі ўсе цяжкія выпрабаванні сусветнай імперыялістычнай бойні, якіх не маглі зламаць ніякія праследванні царскага ўраца. Іменна гэты слой перадавых рабочых склаў асноўнае ядро большэвіцкай партыі ў 1917 годзе.

«Правда» 1912 года — гэта закладка фундамента для перамогі большэвізма ў 1917 годзе». (Сталін).

Як толькі выбухнула імперыялістычная бойня, партыі II Інтэрнацыянала аказаліся слугамі буржуазіі, сталі староннікамі імперыялістычнай вайны. Партыі II Інтэрнацыянала ўтапталі ў гразь рашэнні социялістычных кангрэсаў, накіраваных супроць вайны. Толькі партыя большэвікоў, партыя **новага** тыпу, якая ў корані адрозніваецца ад рэфармісцкіх партый II Інтэрнацыянала, захавала вернасць сцяга пролетарскага інтэрнацыяналізма, стойка падняла гэты сцяг ў агні і буры імперыялістычнай вайны.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) з патрасаючай сілай кляйміць ганьбай здраду справе социялізма з боку партый II Інтэрнацыянала, паказвае з усёй глыбінёй, які мог-бы быць ход гістарычных падзей, калі-б партыі II Інтэрнацыянала выканалі свой абавязак — барацьбы супроць імперыялістычнай вайны.

«Вайна не мела-б такога разбуральнага характару, і, можа быць, нават зусім не разгарнулася-б в такой сілай, калі-б партыі II Інтэрнацыянала не здрадзілі справе рабочага класа, калі-б яны не парушылі рашэнняў Кангрэса II Інтэрнацыянала супроць вайны, калі-б яны рашыліся актыўна выступіць і ўзняць рабочы клас супроць сваіх імперыялістычных урадаў, супроць падпальшчыкаў вайны», — чытаем мы ў «Кароткіх вывадах» па шостаму раздзелу.

Гэты абвінаваўчы прыгавор гісторыі партыям II Інтэрнацыянала з'яўляецца разам з тым суровым абвінавачаннем усім тым замежным «социялістам», якія ў нашы дні тармозяць актыўную барацьбу рабочага класа супроць фашысцкіх падпальшчыкаў вайны.

У агні імперыялістычнай вайны канчаткова склалася геніяльная ленінская тэорыя социялістычнай рэволюцыі. З выключнай тэарэтычнай глыбінёй раскрывае шосты раздзел Гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) **тэорыю і тактыку** большэвіцкай партыі па пытаннях вайны, міру і рэволюцыі.

«Большэвікі не былі простымі пацыфістамі (староннікамі міру), уздыхаючымі аб міры і абмяжоўваючыміся прапагандай міру, як гэта рабіла большасць левых социял-дэмакратаў. Большэвікі стаялі за актыўную рэволюцыйную барацьбу, за мір аж да звяржэння ўлады ваяўнічай імперыялістычнай буржуазіі. Большэвікі звязвалі справу міру са справай перамогі пролетарскай рэволюцыі, лічачы, што найбольш верным сродкам для ліквідацыі вайны і заваявання справядлівага міру, міру без анексій і кантрыбуцый, — з'яўляецца звяржэнне ўлады імперыялістычнай буржуазіі, — гаворыцца ў шостым раздзеле Кароткага курса гісторыі ВКП(б).

Супроць меншавіцка-эсэраўскага адрачэння ад рэволюцыі і здрадніцкага лозунга аб захаванні «грамадзянскага міру» ў часе імперыялістычнай бойні большэвікі высунулі лозунг «**ператварэння вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую**». Супроць меншавіцка-эсэраўскай палітыкі абароны буржуазнай бацькаўшчыны большэвікі высунулі палітыку «**паражэння свайго ўрада ў імперыялістычнай вайне**».

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) дае класічнае ленінска-сталінскае вызначэнне двух родаў войн:

а) вайна **справядлівая**, незахватніцкая, вызваленчая, маючая мэтай або абарону народа ад замежнага нападу і спроб яго заняволення, або вызваленне народа ад рабства капіталізма, або, нарэшце, вызваленне калоній і залежных краін ад гнёту імперыялістаў, і

б) вайна **несправядлівая**, захватніцкая, маючая мэтай захват і заняволенне чужых краін, чужых народаў.

«Вайну першага рода, — чытаем мы ў Кароткім курсе гісторыі ВКП(б), — большэвікі падтрымлівалі. Што датычыць вайны другога роду, большэвікі лічылі, што супроць яе трэба весці рашучую барацьбу аж да рэволюцыі і звяржэння свайго імперыялістычнага ўрада».

Вайна 1914 года была вайной несправядлівай, захватніцкай. Гэта была вайна ў імя інтарэсаў капітала, — і большэвікі вялі супроць яе рашучую барацьбу, арганізуючы пролетарыят на звяржэнне імперыялістаў.

Шосты раздзел Кароткага курса гісторыі ВКП(б) дае глыбокі аналіз важнейшых ленінскіх работ, якія адносяцца да гэтага перыяда («Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма», артыкулы «Аб лозунгу Злучаных Штатаў Еўропы» і «Ваенная праграма пролетарскай рэволюцыі»).

Ужо ў 1905 годзе ў сваёй геніяльнай рабоце «Дзве тактыкі социял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі» Ленін намеціў асновы тэорыі социялістычнай рэволюцыі. Праз дзесяць год, у 1915 годзе, Ленін адкрывае закон няроўнамернасці эканамічнага і палітычнага развіцця капіталізма. Выходзячы з гэтага закона, Ленін фармуліруе свой геніяльны вывад аб магчымасці прарыва імперыялістычнага фронта пролетарыятам дзе-небудзь у адным месцы або ў некалькіх мясцах, — вывад аб **магчымасці** перамогі социялізма першапачаткова ў нямногіх ці нават **у адной**, асобна ўзятай, капіталістычнай краіне.

«Гэта была **новая**, закончаная тэорыя социялістычнай рэволюцыі, тэорыя магчымасці перамогі социялізма ў асобных краінах, аб умовах яго перамогі, аб перспектывах яго перамогі, тэорыя, асновы якой былі намечаны Леніным яшчэ ў 1905 годзе ў брашуры «Дзве тактыкі социял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі».

Яна ў корані разыходзілася з той установкай, якая мела хаджэнне сярод марксістаў у перыяд **даімперыялістычнага** капіталізма, калі марксісты лічылі, што перамога социялізма ў адной якой-небудзь краіне немагчыма, што перамога социялізма адбудзецца адначасова ва ўсіх цывілізаваных краінах. Ленін, на аснове даных аб **імперыялістычным** капіталізме, выкладзеным у яго выдатнай кнізе «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма», перавярнуў гэтую ўстаноўку, як устарэўшую, і даў новую тэарэтычную ўстаноўку, у сілу якой адначасовая перамога социялізма ва ўсіх краінах лічыцца **немагчымай**, а перамога социялізма ў адной, асобна ўзятай, капіталістычнай краіне прызнаецца **магчымай**.

Неацанімае значэнне ленінскай тэорыі социялістычнай рэволюцыі заключаецца не толькі ў тым, што яна ўзбагаціла марксізм новай тэорыяй і рушыла яго наперад. Яе значэнне заключаецца яшчэ ў тым, што яна дае рэволюцыйную перспектыву пролетарыям асобных краін, развязвае іх ініцыятыву ў справе націску на сваю, нацыянальную, буржуазію, вучыць іх выкарыстаць абстаноўку вайны для арганізацыі такога націску і ўмацоўвае іх веру ў перамогу пролетарскай рэволюцыі.

Такая вось была тэарэтычная і тактычная ўстаноўка большэвікоў па пытаннях вайны, міру і рэволюцыі». (Кароткі курс гісторыі ВКП(б).

Можна смела сказаць, што ні адна яшчэ перадавая тэорыя ў свеце не мела і не мае такога важнага значэння для лёсу чалавецтва, для ператварэння свету, як ленінская тэорыя социялістычнай рэволюцыі.

Пад сцягам гэтай тэорыі творчага марксізма перамагла Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя. Ленінскую тэорыю магчымасці перамогі социялізма адстаяў у баях з апартуністамі прадаўжальнік справы Леніна таварыш Сталін і ўзброіў гэтай тэорыяй ўсю партыю, совецкі народ.

Гэта ленінска-сталінская тэорыя, авалодаўшы масамі, сапраўды стала **матэрыяльнай сілай**, ператварыўшыся ў сусветна-гістарычныя перамогі першай і другой пяцігодак, у перамогі социялізма на адной шостай часткі зямнога шара.

Ленінская тэорыя социялістычнай рэволюцыі, якая забяспечвае перамогу социялізма ў СССР, яркім пражэктарам асвятляе шлях рабочаму класу ўсяго свету, мабілізуе яго на барацьбу супроць капіталістычнага рабства і прыгнечання. Вялікі і непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна пераможна рэе над нашай краінай. Пад гэтым сцягам згуртоўваюцца ўсе перадавыя, рэволюцыйныя сілы свету — супроць капіталізма, супроць фашысцкіх падпальшчыкаў вайны, за мір і шчасце народаў!

«ПРАВДА», 13 IX.

I. СТАЛІН

ДА РАССТРЭЛУ 26-ці БАКІНСКІХ ТАВАРЫШОЎ АГЕНТАМІ АНГЛІЙСКАГА ІМПЕРЫЯЛІЗМА*)

Людаеды англійскага імперыялізма

Мы прапануем увазе чытачоў два дакументы, якія сведчаць аб зверскай расправе англійскіх імперыялістаў з адказнымі работнікамі Совецкай улады ў Баку восенню мінулага года. Крыніца гэтых дакументаў — Бакінская эсэраўская газета «Знамя труда» і Бакінская газета «Единая Россия», г. зн. тыя самыя колы, якія ўчора яшчэ клікалі англічан на дапамогу, прадаючы большэвікоў, а цяпер па ходу падзей прымушаны выкрываць учарашніх сваіх саюзнікаў.

Першы дакумент апавядае аб варварскім расстрэле англійскім капітанам Тіг-Джонсам 26-ці совецкіх работнікаў горада Баку (Шаумяна, Джапарыдзе, Фіалетава, Малыгіна і інш.) без суда і следства, ноччу 20-га верасня 1918 года на шляху ад Красナводска да Асхабада, куды яны накіроўваліся Тіг-Джонсам у якасці ваеннапалонных. Тіг-Джонс і яго эсэра-меншавіцкія кампаньёны спадзяваліся было замяць справу, маючы намер пусціць у ход фальшывыя пасведчанні аб «натуральнай» смерці Бакінскіх большэвікоў у турме ці ў больніцы, але гэты план, відавочна, праваліўся, бо засталіся, аказваецца, сведкі, якія не хочуць маўчаць і гатовы выкрыць англійскіх дзікуноў да канца. Гэты дакумент падпісан эсэрам Чайкіным.

Другі дакумент адлюстроўвае гутарку англійскага генерала Тамсона з аўтарам першага дакумента, Чайкіным, у канцы сакавіка 1919 года. Генерал Тамсон патрабуе ад Чайкіна назваць сведкаў зверскай расправы англійскага капітана Тіг-Джонса з 26-ю Бакінскімі большэвікамі. Чайкін гатовы прадставіць дакументы і назваць сведкаў пры ўмове ўтварэння следчай камісіі з прадстаўнікоў англійскага камандавання, Бакінскага насельніцтва і Туркестанскіх большэвікоў, прычым Чайкін патрабуе гарантыі, што Туркестанскія сведкі не будуць забіты агентамі англічан. З прычыны таго, што Тамсон не прымае прапановы аб следчай камісіі і не дае гарантыі асабістай бяспечнасці сведкаў, гутарка абрываецца і Чайкін удаляецца. Дакумент цікавы ў тых адносінах, што ён, ускосна пацвярджаючы варварства англійскіх імперыялістаў, не гаворыць, а крычыць аб беспакаранасці і дзікім разгуле англійскіх агентаў, якія распраўляюцца з Бакінскімі і Закаспійскімі «тубыльцамі», як з чорнаскурымі ў Цэнтральнай Афрыцы.

Гісторыя 26-ці Бакінскіх большэвікоў прадстаўляецца ў наступным выглядзе. У жніўні 1918 года, калі турэцкія войскі падышлі шчыльна да Баку, а эсэра-меншавіцкія члены Бакінскага Совета, наперакор большэвікам, захапілі за сабою большасць Совета і заклікалі на дапамогу англійскіх імперыялістаў, Бакінскія большэвікі на чале з Шаумянам і Джапарыдзе, застаўшыся ў меншасці, знялі з сябе поўнамоцтвы і ачысцілі поле для палітычных супрацўнікаў. Большэвікі парашылі эвакуіравацца ў Петроўск, бліжэйшы пункт Совецкай улады, са згоды новастворанай тады ў Баку англійска-эсэра-меншавіцкай улады. Але па дарозе ў Петроўск параход з Бакінскімі большэвікамі і іх сем'ямі быў абстрэлян пагнаўшыміся за ім англійскімі судамі і адведзены ў Краснаводск. Гэта было ў жніўні. Расійскі Совецкі ўрад некалькі разоў звяртаўся пасля гэтага да англійскага камандавання, патрабуючы вызвалення Бакінскіх таварышоў і іх сем'яў у абмен на палонных англічан, але англійскае камандаванне кожны раз адмаўлялася. Яшчэ з кастрычніка месяца сталі паступаць весткі ад прыватных асоб і арганізацый аб расстрэле Бакінскіх таварышоў. Пятага сакавіка 1919 года Астрахань атрымала радыё з Тыфліса аб тым, што «Джапарыдзе і Шаумяна ў распараджэнні англійскага камандавання няма, што яны па мясцовых вестках самачынна групай рабочых забіты ў верасні каля Кізіл-арвата». Відавочна, што была першая афіцыяльная спроба англійскіх забойцаў зваліць віну за свае зверствы на рабочых, бязмежна любіўшых і Шаумяна і Джапарыдзе. Цяпер, пасля надрукавання памянёных вышэй дакументаў, трэба лічыць даказаным, што нашы Бакінскія таварышы, самавольна адышоўшыя з палітычнай арэны і накіроўваючыяся ў Петроўск у парадку эвакуацыі, былі сапраўды расстраляны без суда і следства людаедамі «цывілізаванай» і «гуманнай» Англіі.

У «цывілізаваных» краінах прынята гаварыць аб тэроры і жахах большэвікоў. Прычым англа-французскія імперыялістаў паказваюць звычайна як ворагаў тэрору і расстрэлаў. Ці-ж не ясна, што ніколі яшчэ Совецкая ўлада не распраўлялася з сваімі праціўнікамі так нізка і подла, як «цывілізаваныя» і «гуманныя» англічане, што толькі імперыялісцкія людаеды, наскрозь прагніўшыя і згубіўшыя ўсякую маральную сілу, могуць мець патрэбу ў начных забойствах і разбойніцкіх нападах на бяззбройных палітычных работнікаў процілеглага лагера? Калі ёсць яшчэ людзі, якія сумняваюцца ў гэтым, няхай прачытаюць прыведзеныя ніжэй дакументы і назавуць рэчы сваімі імёнамі.

Запрашаючы англічан у Баку і прадаючы большэвікоў, Бакінскія меншавікі і эсэры думалі «выкарыстаць» англійскіх «гасцей», як сілу, прычым меркавалася, што гаспадарамі ў краіне застануцца меншавікі і эсэры, «госці»-ж паедуць ва-сваясі. На справе атрымалася адваротнае: «госці» сталі неабмежаванымі гаспадарамі, эсэры і меншавікі ператварыліся ў абавязковых удзельнікаў зладзейскага і нізкага забойства 26-ці камісараў, прычым эсэры вымушаны былі перайсці ў апазіцыю, асцярожна выкрываючы новаяўленых гаспадароў, а меншавікі ў сваёй Бакінскай газеце «Искра» вымушаны прапаведваць блок з большэвікамі супроць учарашніх «жаданых гасцей». Ці-ж не ясна, што саюз эсэраў і меншавікоў з агентамі імперыялізма ёсць «саюз» рабоў і лакеяў з сваімі гаспадарамі? Калі ёсць яшчэ людзі, якія сумняваюцца ў гэтым, няхай прачытаюць прыведзеную ніжэй «гутарку» генерала Тамсона з панам Чайкіным і скажуць па совесці: ці падобны пан Чайкін на гаспадара, а генерал Тамсон на «жаданага госця».

*) Надрукавана ў газеце «Известия ВЦИК» ад 23 красавіка 1919 г. № 85 (637). Там-жа надрукаваны два дакументы, якія ўпамінаюцца ў артыкуле І. В. Сталіна: першы — «Кара смерцю 26-ці камісараў» з бакінскай эсэраўскай газеты «Знамя труда», № 55 за 1919 г.; другі — «Спатканне генерала Тамсона з панам Чайкіным 23 сакавіка 1919 г.» з бакінскай газеты «Единая Россия», № 71 за 1919 г.



СКВЕР І ПЛОШЧА ІМЯ 26 БАКІНСКІХ КАМІСАРАЎ У гор. БАКУ. На пярэднім плане помнік 26 бакінскім камісарам. (СФ).

Аб вывучэнні гісторыі ВКП(б)

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Выпуск Кароткага курса гісторыі ВКП(б), распрацаванага Камісіяй ЦК ВКП(б), асабіста вялікім Сталіным, з'яўляецца падзеяй сусветнага значэння. Кароткі курс гісторыі ВКП(б) — найвялікшы гістарычны, навуковы дакумент — узнімае на велізарную палітычную вышыню справу вывучэння ўсёй партыяй і совецкім народам гісторыі ВКП(б), гісторыі слаўнай барацьбы і перамог большэвікоў за справу комунізма.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) будзе спрыяць яшчэ большаму павышэнню рэволюцыйнай пільнасці, ідэйнай узброенасці і падняццю боездольнасці комуністаў, комсамольцаў і ўсіх працоўных, яшчэ мацней згуртуе ўвесь совецкі народ вакол партыі большэвікоў, вакол непераможнага сцяга Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

ЦК КП(б)Б лічыць важнейшай задачай усіх партыйных органаў і партыйных кіраўнікоў арганізаваць сур'ёзнае і глыбокае вывучэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б) усімі комуністамі і, асабліва, партыйнымі кадрамі.

ЦК КП(б)Б прапануе:

1. Пакласці ў аснову работы сеткі партыйнай асветы вывучэнне гісторыі ВКП(б) па Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б). Разгарнуць сетку гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі, забяспечыўшы на справе вывучэнне гісторыі ВКП(б) кожным комуністам, і перш за ўсё кадрамі партыйнага актыва. У сувязі з гэтым пашырыць сетку гурткоў для партыйнага актыва, арганізаваць ва ўсіх раёнах групы палітычнай самаадукацыі для кіруючых партыйных работнікаў па вывучэнню гісторыі ВКП(б) на аснове новага падручніка.

ЦК КП(б)Б лічыць неабходным, каб кожны сакратар гаркома, райкома, парткома і парторг не толькі арганізавалі вывучэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б), але і асабіста кіравалі заняткамі гуртка па вывучэнню гісторыі партыі, паказваючы прыклад узорнай пастаноўкі справы прапаганды вывучэння Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

2. Прапанаваць абкомам, гаркомам і райкомам КП(б)Б аказаць неабходную дапамогу комсамольскім арганізацыям у вывучэнні гісторыі ВКП(б), для чаго вылучыць падрыхтаваных прапагандыстаў і арганізаваць для іх і комсамольцаў сталыя кансультацыі, лекцыі і даклады па гісторыі партыі.

Даручыць ЦК комсамола прадставіць на зацвярджэнне Бюро ЦК прапановы па арганізацыі вывучэння гісторыі партыі комсамольскім актывам, комсамольцамі і несаюзнай моладдзю.

3. Абавязаць Аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б арганізаваць курсы па перападрыхтоўцы прапагандыстаў, паклаўшы ў аснову вывучэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б).

Арганізаваць ва ўсіх раённых і заводскіх партыйных кабінетах сталыя кансультацыі, лекцыі, даклады па гісторыі партыі як для партыйнага актыва, так і для ўсіх членаў партыі і комсамольцаў.

4. Адзначаючы велізарную зацікаўленасць працоўных да вывучэння гісторыі ВКП(б) па новаму падручніку,— Бюро ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партыйным арганізацыям, з удзелам прафсаюзаў, забяспечыць шырокае азнаямленне ўсіх працоўных са слаўнай гісторыяй партыі Леніна — Сталіна шляхам арганізацыі гурткоў, лекцый, дакладаў, вылучыўшы для гэтага высокакваліфікаваныя кадры прапагандыстаў.

Сакратарам партыйных камітэтаў і парторгам забяспечыць штодзённую дапамогу і кіраўніцтва справай вывучэння гісторыі партыі працоўнымі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ПАНАМАРЭНКА.

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ ПАРТЫІ ЛЕНІНА-СТАЛІНА

Работнікі літаратурна - мастацкага фронта, як і ўсе працоўныя нашай рэспублікі, з радасцю сустрэлі апублікованы ў «Правде» Кароткі курс гісторыі ВКП(б). Гэтая велізарнай палітычнай важнасці навуковая праца створана па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле таварыша Сталіна і адобрана ЦК ВКП(б).

У Кароткім курсе гісторыі ВКП(б) паказана слаўная гісторыя барацьбы рабочага класа пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і велізарнага рэволюцыянера і ператваральніка чалавечага грамадства, неўміручага Леніна—генія пролетарскай рэволюцыі, правадыра рабочага класа і прыгнечаных народаў усяго свету.

З імем Леніна і Сталіна звязана новая эра ў развіцці чалавецтва. Іменна таму так радасна сустрэлі працоўныя выданне гісторыі партыі. Перамога Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі была ажыццёўлена пад непасрэдным валдзіцельствам Леніна. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна быў скінут капіталістычны лад у царскай Расіі і ўстаноўлена дыктатура пролетарыята. Зараз у нашай вялікай совецкай краіне ў асноўным пабудавана социялістычнае грамадства.

Гісторыя ВКП(б) з'яўляецца навуковай гісторыяй вялікай партыі Леніна—Сталіна. У Кароткім курсе гісторыі партыі абагулен увесь велізарны вопыт барацьбы і перамог нашай комуністычнай партыі, дадзена навуковае марксісцка - ленінскае абгрунтаванне гісторыі рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята—за пабудову бяскласавага социялістычнага грамадства.

Зараз галоўнейшая задача заключаецца ў тым, каб падрыхтавацца да глыбокага вывучэння гісторыі ВКП(б), без чаго немысліма засваенне і глыбокае веданне законаў грамадскага развіцця. Наша партыя, створаная Леніным і Сталіным, заўсёды надавала велізарнае значэнне рэволюцыйнай тэорыі. «Без рэволюцыйнай тэорыі, — пісаў Ленін, — не можа быць рэволюцыйнага руху»... «**Ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй**».

«Тэорыя, калі яна з'яўляецца сапраўднай тэорыяй, дае практыкам сілу арыентыроўкі, яснасць перспектывы, упэўненасць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы» (**Сталін**).

Партыя большэвікоў, кіруючыся навуковай тэорыяй марксізма-ленінізма, упэўнена вяла рабочы клас, усіх працоўных ад перамогі да перамогі. Гэтая ўпэўненасць грунтавалася на глыбокім веданні законаў грамадскага развіцця, на веданні законаў социялістычнай рэволюцыі, на веданні прыроды класаў. Без гэтых ведаў перамога над капіталізмам была-б немагчыма.

Наша комуністычная партыя прадстаўляе найвялікшую непераможную сілу. Магутнасць і сіла яе яшчэ больш узрастуць, калі ўсе члены партыі будуць нястомна працаваць над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню, будуць авалодваць марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Ворагі народа, арудаваўшыя на літаратурна-мастацкім фронце, рабілі ўсё для таго, каб дэзарыентаваць партарганізацыю і асобных работнікаў літаратуры і мастацтва і праводзіць сваю брудную справу, і гэта ім часткова ўдавалася зрабіць толькі таму, што не ўсе члены партыі, працуючыя на гэтым адказнейшым участку працы, былі дастаткова падкаваныя навуковай тэорыяй марксізма-ленінізма. Зараз партарганізацыі літаратурна-мастацкіх устаноў павінны забяспечыць падрыхтоўку прапагандыстаў па вывучэнню гісторыі партыі Леніна—Сталіна.

Паяўленне Кароткага курса гісторыі партыі ёсць велізарнейшая падзея ў ідэйным жыцці нашай партыі і ўсяго сусветнага комуністычнага руху. Глыбокае вывучэнне гісторыі ВКП(б) патрабуе асаблівай падрыхтоўкі, якая павінна пачацца з падрыхтоўкі прапагандысцкіх кадраў, — гэта асноўнае і цэнтральнае пытанне, без вырашэння якога нельга вырашаць іншыя пытанні, звязаныя з вывучэннем гісторыі партыі.

Кіруючыя партыйныя работнікі літаратурна-мастацкіх галін павінны забяспечыць найлепшую арганізацыю прапаганды, падбор і падрыхтоўку прапагандысцкіх кадраў. Галоўнае заключаецца ў тым, каб прапагандыстамі ў першую чаргу сталі самі кіруючыя партыйныя работнікі — сакратары і члены партыйных камітэтаў партарганізацый у літаратурна-мастацкіх установах.

«Асноўнай умовай поспеху прадстаячых заняткаў у гуртках з'яўляецца папярэдняя індывідуальная чытка раздзелаў Кароткага курса гісторыі ВКП(б). Трэба даць магчымасць кожнаму комуністу ўважліва прачытаць апублікаваныя старонкі падручніка і добра ўявіць прачытанае. Толькі пры сапраўдным азнаямленні слухачоў з Кароткім курсам магчыма гаварыць аб паспяховай глыбокай рабоце ў гуртках...»

Трэба, каб прапрацоўка была праведзена на ўзроўні ленінска-сталінскага Кароткага курса гісторыі ВКП(б). Рашуча павядзем барацьбу з несур'ёзнымі адносінамі да прапагандысцкай работы па вывучэнню гэтай вялікай палітычнай важнасці навуковай работы.

«Вывучэнне гісторыі ВКП(б) узбагачае вопытам барацьбы рабочых і сялян нашай краіны за социялізм.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б), вывучэнне гісторыі барацьбы нашай партыі з усімі ворагамі марксізма-ленінізма, з усімі ворагамі працоўных дапамагае **авалодваць большэвізмам**, павышае палітычную пільнасць.

Вывучэнне герайчнай гісторыі большэвіцкай партыі ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, веданнем рухаючых сіл рэволюцыі.

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) умацоўвае ўпэўненасць у канчатковай перамозе вялікай справы партыі Леніна — Сталіна, перамозе комунізма ва ўсім свеце».

ДА НОВАГА ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНА

Сёння мы змяшчаем выказванні работнікаў мастацтва БССР аб ітогах мінулага тэатральнага сезона і перспектывах наступаючага — водгукі на артыкул «Аб пытаннях работы тэатраў БССР» Н. Андрэева, змешчаны ў № 50 (ад 11 верасня 1938 г.) нашай газеты.

Работнікі мастацтва ўздымаюць вельмі актуальныя, хвалюючыя пытанні творчага жыцця, якія павінны быць вырашаны Упраўленнем па справах мастацтваў і ўсёй нашай грамадскасцю.

Мы заклікаем работнікаў усіх галін мастацтва ўключыцца ў абмеркаванне пастаўленых нашай газетай пытанняў творчага жыцця тэатраў БССР.

ГОД АДКАЗНАЙ РАБОТЫ

Сезон 1938—39 года абяцае і павінен быць для калектыва вельмі напружаным як у сэнсе колькасці выпускаемых пастановак, так і ў адносінах уздыму іх якасці.

Улічваючы памылкі мінулага тэатральнага сезона,—новае кіраўніцтва тэатра павяло работу так, каб калектыў тэатра ў чаканні пераходу ў Вялікі тэатр змог планамерна працаваць у памяшканні Яўрэйскага тэатра. Калектыў, перахварэўшы ад бяздзейнасці, актыўна распачаў вытворчае жыццё. Ідзе ўпартая, сур'ёзная работа па пастаноўцы «Царскай нявесты», якою намечана адкрыць сезон у другой палавіне кастрычніка, узнаўляецца «Тоска», «Рыгалета», «Ціхі Дон». Падрыхтоўваюцца пастаноўкі опер «Русалка» і «Чыо-Чыо-Сан», якія тэатр пакажа пасля «Царскай нявесты». Балет рыхтуе да адкрыцця сезона «Лебядзінае возера», «Марную перасцярогу» і першы беларускі савецкі балет «Салавей».

Цэнтрам усёй работы тэатра з'яўляецца опера «Міхась Падгорны», якая будзе паказана цалкам у канцэртным выкананні да 20-годдзя комсамола.

Апрача работнікаў тэатра, дастаткова добра вядомых нашай грамадскасці, вырасшых, выхаваных у БССР, паказаўшых сябе ў радзе пастановак — Дзенісаў, Балоцін, Друкер, Млодэк, Каліноўскі, Мурамцаў, Кроз, Жэзмер, Пукст, Архіпаў і інш., якія па праву зараз складаюць асноўнае ядро тэатра, у калектыў уліўся рад запрошаных, патрэбных нам работнікаў, якія таксама з любоўю ўключыліся ў работу, як тт. Малькова, Аляксеева, Цераньцеў, Габаеў, Мегарскі, Хумарава, Лапін, Таленкін, Лапацін, дырыжоры Шнейдэрман, Ратнер і інш.

У калектыве тэатра выраслі здольныя маладыя вакалісты, як Р. Шапіра, Ольшэўская, якія атрымалі заслужанае права на вылучэнне, на атрыманне адказных партый.

Да гэтых маладых растучых кадраў кіраўніцтва тэатра павінна адносіцца з вялікай увагаю. Але яшчэ і зараз у тэатры ёсць недапушчальныя выпадкі, калі маладыя работнікі, як тав. Левіна (вылучаная памочнікам рэжысёра), прадастаўляюцца самім сабе, не маюць дапамогі. Такія выпадкі нецярпімы. Кіраўніцтва тэатра павінна з любоўю, клапатліва расціць маладыя кадры.

Вялікую ўвагу ў наступаючым сезоне патрэбна ўдзяліць павышэнню кваліфікацыі актораў. Для вакалістаў патрэбна арганізаваць гурток камернай музыкі. Кіраўніцтва тэатра павінна праводзіць з вакалістамі дэтальны разгляд і абмеркаванне канцэртнага рэпертуара.

Калектыў за год сваёй вымушанай бяздзейнасці ў сезоне 37—38 года па віне былога кіраўніцтва, праваліўшага сезон і не забяспечыўшага мастацкі і творчы рост работнікаў, — безумоўна адстаў і зараз яму прыходзіцца з падвоенай энергіяй брацца за работу. Правільнае планіраванне рабочага дня актора, умелая расстаноўка творчых сіл у прадстаячых пастаноўках, таварыская этыка ў калектыве, авалоданне культурай у быту і на вытворчасці, моцная дысцыпліна, соцыялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, усведамленне важнасці пастаўленых перад намі задач па хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на фронце мастацтва, актыўны ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці краіны, нарэшце, узаемная дапамога ўсяго калектыва новаму кіраўніцтву,— безумоўна забяспечыць нам і творчы рост і дапамогуць стварэнню высокаякасных спектакляў. Мы павінны ўвайсці ў новы будынак тэатра з беларускімі савецкімі операмі і балетамі і з гонарам прадэманстраваць дасягненні беларускага народа на дэкадзе ў Маскве.

Мой удзел у агульнай вялікай і складанай рабоце нашага тэатра будзе зводзіцца, апрача ўдзелу нараўне з усім калектывам у грамадскім і палітычным жыцці краіны, — да ўдзелу ў пастаноўцы оперы «Русалка» (партыя Наташы) і потым у авалоданні партыяй Марысі ў оперы «Міхась Падгорны». Апрача опернай работы ў гэтым сезоне намечаны, па прыкладу мінулага года, мае канцэрты ў Маскве, Кіеве, Одэсе і Харкаве, дзе мною апрача твораў класікаў будуць выкананы творы савецкіх і, галоўным чынам, беларускіх савецкіх кампазітараў і ў іх апрацоўках беларускія народныя песні.

Работа ўсяму калектыву прадстаіць вялікая, складаная і адказная. Задача новага кіраўніцтва тэатра і ўсяго калектыва — з гонарам яе выканаць ў наступным сезоне.

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ,
заслужаная артыстка БССР.

ЗА ЎЗБАГАЧЭННЕ РЭПЕРТУАРА

Мінулы сезон ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета можна ўспомніць толькі, як дрэнны сон. Ды і сезона, шчыра кажучы, не было. Былым шкодніцкім кіраўніцтвам Управлення па справах мастацтваў тэатр быў даведзен амаль да становішча поўнага заняпаду. Тэатр паглынаў велізарныя дзяржаўныя сродкі і па-сутнасці бяздзейнічаў.

Зараз створаны ўмовы для сапраўднай работы ў асноўным здароваму, моцнаму і жыццездольнаму калектыву тэатра. Тэатр становіцца на правільны шлях, умацоўваецца адміністрацыйнае і мастацкае кіраўніцтва, тэатр ачышчаецца ад нягоднага баласту і паспяхова ідзе па шляху акрэслення свайго творчага твару.

У справе стварэння беларускай оперы прыцягнення кампазітараў і работы з імі тэатр мае значныя разультаты. У партфелі тэатра ёсць ужо гатовая опера «Міхась Падгорны» Цікоцкага, заканчваецца опера «Дрыгва» Багатырова, балет «Салавей» Крошнера. Справай гонару тэатра з'яўляецца выпуск гэтых трох спектакляў у асенне-зімовым сезоне 1938—1939 года. Трэба ўлічыць тое, што да гэтых спектакляў наша грамадскасць прад'яўляе сур'ёзныя і вялікія патрабаванні. Не менш цікавяць грамадскасць і новыя пастаноўкі класічных опер і балетаў («Царская нявеста», «Русалка», «Лебядзінае возера» і інш.). У мінулым, калі не лічыць двух якасна поўнацэнных спектакляў — «Рыгалета» і «Тоска», тэатр, на жаль, нічым не можа пахваліцца. Гэта таксама ўскладае на тэатр адказныя абавязкі.

Яшчэ больш энергічна, клапатліва і ўважліва тэатр павінен прадаўжаць сваю работу па стварэнню беларускага рэпертуара, мець чоткую і мэтанакіраваную лінію, каб да будучага сезона набыць не толькі пэўную колькасць беларускіх опер, а рад такіх твораў, якія-б у сваёй суме адлюстравалі ўсё багатае і шматграннае жыццё беларускага народа, яго гераічнае мінулае, яго цудоўнае сёння.

Велізарная работа прадстаіць тэатру і ў справе ўмацавання і ўзбагачэння кадрамі, стварэння добрых умоў для папаўняючай тэатр моладзі. Падрыхтоўка маладых кадраў у нас належным чынам не разгорнута. І тэатр абавязан адыграць вялікую і вядучую ролю ў падрыхтоўцы для сябе кадраў.

Гэты сезон для тэатра оперы з'явіцца экзаменам перад грамадскасцю Совецкай Беларусі і таму да свайго сезона тэатр павінен быць па-сур'ёзнаму, па-большэвіцку гатовым. Толькі здаўшы гэты экзамен тэатр атрымае права паказаць сябе ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве і гэта будзе для яго заслужанай, радаснай узнагародай.

Мы не можам не сказаць зараз некалькіх слоў і аб другім музыкальным тэатры БССР — Дзяржаўным тэатры музыкальнай камедыі. Ён існуе ў нас каля двух год, а між тым ні з боку Управлення па справах мастацтваў, ні з боку нашага друку і крытыкі да яго не праяўлена да гэтага часу сур'ёзных адносін.

Совецкая аперэта, на жаль, пакуль яшчэ робіць толькі першыя крокі. Гэтая акалічнасць і факт папулярнасці яе ў шырокага гледача прымушаюць асабліва старанна прыглядзецца да работы нашага музыкальнага тэатра, яго творчай установкі, практычнай дзейнасці. Асаблівае значэнне набывае пытанне стварэння беларускай музыкальнай камедыі, прыцягненне да гэтай работы кампазітараў і пісьменнікаў. Апрача беспрадметных і надта нясмелых размоў, мы да гэтага часу яшчэ ні ад Управлення па справах мастацтваў, ні ад самога тэатра нічога не чулі. Тут неабходны рашучы пералом. За гэты сезон павінна быць створана хоць-бы адна беларуская музыкальная камедыя — аперэта. Да работы тэатра павінна быць прыцягнута ўвага грамадскасці, нашай крытыкі, што дапаможа тэатру знайсці правільны творчы шлях.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

---о---

НАШЫ ПАТРАБАВАННІ

Дзяржаўны тэатр юнага гледача існуе шэсць год. Амаль пяць год ён працаваў без свайго памяшкання, без патрэбнага мастацкага кіраўніцтва. Ворагі народа, якія арудавалі ва Упраўленні па справах мастацтваў, рабілі ўсё, каб разваліць тэатр,—насаджаючы варожы рэпертуар, засмечваючы калектыў людзьмі, якія нічога агульнага не мелі з мастацтвам.

У ліпені 1937 года ў рабоце тэатра адбыўся рашучы перелом. Тэатр папоўніўся выпускнікамі ленінградскай студыі і акторамі былога ТРАМа. Мастацкім кіраўніком быў прызначан заслужаны артыст БССР тав. Міровіч, рэжысёрам т. Ю. Палічынецкі.

Тэатр пачаў падрыхтоўку новага рэпертуара. І ў мінулым сезоне тэатр здолеў паказаць свайму гледачу спектаклі: «Як гартавалася сталь», «Ноч у верасні», «Наша зброя».

У гэтым сезоне тэатр пакажа п'есы класічнага рэпертуара, п'есы беларускіх драматургаў і драматургаў брацкіх рэспублік. Асноўнае месца ў рэпертуары зоймуць п'есы для дзяцей.

Да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола тэатр рыхтуе спектакль «Годы выпрабаванняў» маладога драматурга Раймонд. Гэты спектакль пакажа гераічную барацьбу нямецкага комсамола з фашызмам.

Калектыў тэатра здольны даць свайму гледачу цікавыя, высокамастацкія спектаклі. Але для таго, каб тэатр здолеў з поспехам працаваць, яму патрэбна тэрміновая дапамога. Перш за ўсё трэба стварыць належныя ўмовы для творчай работы калектыва і культурныя ўмовы для гледача. З гэтага выцякаюць нашы патрабаванні да Упраўлення па справах мастацтваў: даць магчымасць зрабіць належнае абсталяванне памяшкання тэатра, адпусціць неабходныя сродкі для магчымасці запрашэння высокакваліфікаваных майстроў.

XII з'езд комсамола Совецкай Беларусі вынес рашэнне аб стварэнні тэатра імя ленінскага комсамола. На жаль, дагэтуль гэта рашэнне не рэалізавана. ЦК ЛКСМБ павінен ажыццявіць рашэнне з'езда.

Г. ШУСТЭР,
дырэктар Тэатра юнага гледача.



Кадр з новага мульціплікацыйнага фільма «Тры мядзведзі» па казцы Л. Н. Талстога.

ХВАЛЮЮЧАЯ ПАЭМА АБ НАРОДЗЕ І ВАЙНЕ

«ВАЙНА» Я. КОЛАСА У ДЗЯРЖАЎНЫМ ВІЦЕБСКІМ ТЭАТРЫ

У антракце пасля першага акта я падслухаў цікавую размову. Уражаннямі ад спектакля дзяліліся пажылыя людзі, сведкі і ўдзельнікі тых падзей, якія паказаны ў п'есе Якуба Коласа «Вайна».

— Для тых, хто не бачыў усяго гэтага, — гаварыў самы старэйшы з субяседнікаў, — можа і не верыцца, што так было ў сапраўднасці. А я выцерпеў і перажыў вайну. І от калі загаласілі жанкі, калі хлопцы заспявалі сумную навабранскую песню «Последний нонешний денечек» — сэрца зашчымела. Так і паўстала перад вачыма тое далёкае і жудаснае, якому ўжо больш ніколі не вярнуцца, — няхай яно спрахне...

Гэтыя скупыя словы гледача — лепшая ацэнка спектакля. У іх больш пераканаўчасці, чым у дзесятках самых хвалебных рэцэнзій тэатральных знаўцаў.



«ВАЙНА» Я. КОЛАСА У ВІЦЕБСКІМ ТЭАТРЫ.

На здымку: артыст Ц. СЯРГЕЙЧЫК— дзед Мікіта, артыстка Л. ГЕПНЕР— Гараська. Фота І. Каплінскага.

У чым эмацыянальная сіла «Вайны»? У чым прывабнасць спектакля, які карыстаецца поспехам у гледача ўжо на працягу параўнаўча доўгага часу?

Перш за ўсё — у праўдзівасці падзей, у арганічным адзінстве формы са зместам — яркага нацыянальнага каларыта твора з думкамі і спадзяваннямі народа, галоўная роля якому і належыць у спектаклі.

Тэатр і пастаноўшчыкі гэтай п'есы (пастаноўшчык В. Дарвішэў і рэжысёр Ц. Сяргейчык) акцэнтуюць увагу не на вузкаасабістым чалавечым лёсе, а на народзе, на падзеях, на самую іх атмасферу, на паказ магутнага дыхання людской масы. Гэта, уласна кажучы, дыктавалася самім творам, аўтар якога падыходзіў да тэмы аб вайне ў першую чаргу, як паэт і як драматург — у другую. Не зразумеў-бы гэтага тэатр, наўрад ці стварыў-бы ён такі паэтычны спектакль, сапраўдную лірыка-драматычную паэму, якую мы з цікавасцю глядзім зараз.

Тыя, хто папракаюць «Вайну» ў адсутнасці зместу, проста не разумеюць самой мастацкай прыроды твору. Паўтараем, «Вайна» — паэтычны, музыкальны спектакль. Кампазітар М. Красеў знайшоў каларытныя, поўныя лірычнага пачуцця мелодыі, якія перадаюць асноўныя матывы тэмы. І сіла ўздзеяння спектакля на гледача ва многім залежыць ад удалага музыкальнага афармлення. У «Вайне» музыка не механічны дадатак, не традыцыйны кампанент, а трывалая эмацыянальная канва ўсяго зместу.

У «Вайне» няма сюжэтнага цэнтра, які-б падпарадкоўваў сабе ўсе паводзіны герояў. Але гэта не азначае, што ў спектаклі няма зместу.

Каханне Марыны і Алеся (артысты Н. Звездачотаў і М. Белінская) далёкі намёк на нейкі цэнтр, але гэта не сюжэт. Добра, што артысты праводзяць праз спектакль гэтае каханне не самастойнай лініяй, а толькі пункцірнымі кропкамі, пераносячы ўсю ўвагу на галоўную творчую ідэю, пакладзеную аўтарам у аснову твору — народ і вайна. Праз гэтую прызму мы бачым узаемасувязь усіх герояў, сутыкненне іх інтарэсаў. Падпарадкаванне спектакля гэтай задачы дало магчымасць творчаму калектыву знайсці найбольш глыбокае мастацкае выяўленне такіх вобразаў, як парабак Дзям'ян Дзяменя (засл. арт. А. Ільінскі), палінэйскі Шышла (арт. П. Малчанаў), Караліна (арт. Л. Мазалеўская), стварыць яркія, сапраўды народныя сцэны, як увесь першы акт — провады навабранцаў, як фінальная карціна — адыход з вёскі чырвонагвардзейскага атрада.

Гаворачы аб недахопах у «Вайне», не трэба забывацца аб жанравай прыродзе спектакля. А недахопы ў «Вайне» ёсць. І асноўны з іх, на нашу думку, — расцягненасць спектакля, марудпасць яго тэмпа ў рашаючых сцэнах—сцэнах фронта, часткова першага акта. Максімальная кандэнсацыя зрабіла-б спектакль яшчэ больш дзейным, больш яркім і маляўнічым.

Ц. КРЫСЬКО.

---о---

Да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола

ШТО РЫХТУЮЦЬ МАСТАКІ

Мастакі БССР актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку XX гадавіны ленінска-сталінскага комсамола. 20 жывапісцаў і скульптараў Менска ўзялі на сябе абавязацельствы напісаць партрэты і вылепіць бюсты знатных людзей, стаханаўцаў. Такія-ж абавязацельствы ўзялі на сябе мастакі і скульптары Гомеля і Віцебска.

Паводле ініцыятывы агульнага сходу мастакоў Менска пачалася падрыхтоўка да выстаўкі летніх эцюдаў, прысвечанай 20-годдзю комсамола. Некаторыя мастакі прынеслі ўжо свае работы.

У Віцебску арганізуецца выстаўка работ вучняў мастацкага вучылішча.

Рад работ беларускіх мастакоў накіраван у Маскву на ўсесаюзную выстаўку, прысвечаную 20-годдзю ВЛКСМ.

Песні, прысвечаныя 20-годдзю ленінскага комсамола

15 верасня адбылося чарговае праслухванне песень, прысвечаных 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола, напісаных беларускімі кампазітарамі.

На гэты раз для выканання песень была запрошана салістка Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета тав. Аламантава.

Цікавую і арыгінальную музыку напісаў комсамолец-кампазітар П. Падкавыраў на тэкст В. Лебедзева-Кумача «Комсамольская пагранічная». Матыў песні лёгка запамінаецца.

Кампазітар М. Іваноў напісаў на тэкст А. Астрэйкі карагодную песню. Усе прысутныя на творчым пасяджэнні кампазітараў адзначылі песню М. Іванова ўдалай.

Кампазітар Аладаў напісаў цікавую музыку на тэкст А. Бялевіча «То маршал дазор правярае».

Адобраны для масавага пашырэння песні кампазітараў — Палонскага «Праводзіны на граніцу», Ефімава «На граніцу», Н. Сакалоўскага «Карагодная».

Беларускія кампазітары на гэтым не спыняюцца. Цяпер яны працуюць над новымі песнямі і баладамі, прысвечанымі слаўнай гадавіне ленінска-сталінскага комсамола.

-о-

ПЯРШЫНСТВА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ ПА ЛЕГКАЙ АТЛЁТЫЦЫ

9—10 верасня ў Менску адбыліся агульнагарадскія спаборніцтвы фізкультурных калектываў на каманднае і асабовае пяршынства па шматбор'ю і нормах на значок ГПА. У спаборніцтвах прынялі ўдзел фізкультурныя арганізацыі заводаў імя Молатава, імя Варашылава, імя Кірава, фабрыкі «КІМ», мясакамбіната, пажарнай аховы, работнікаў мастацтваў і інш. — усяго 21 калектыў. У каманду работнікаў мастацтваў увайшло 11 чалавек: восем з Тэатра оперы і балета (Леангард, Вепрынскі, Быхаўцоў, Самохін, Шчолкіна, Пекур, Нікалаева, Сцепанец) і тры з Белдзяржфілармоніі (Малюшын, Мельнікаў, Лапша).

Першае месца на спаборніцтвах заняла каманда работнікаў мастацтваў.

У бегу на 100 і 1000 метраў для мужчын і 100 і 500 метраў для жанчын, у прыжках у вышыню і даўжыню у кіданні гранаты і іншых спаборніцтвах каманда работнікаў мастацтваў дала лепшыя паказальнікі і ў суме ачкоў адваявала пяршынства.

Асабовае пяршынства ў спаборніцтвах занялі салісткі балета тав. **Шчолкіна** (першае месца) і тав. **Пекур** (другое месца).

Перамозе калектыва Тэатра оперы і балета спрыяла тое, што фізкультурная група тэатра, якая налічвае каля 60 чалавек, сістэматычна займаецца лёгкай атлётыкай і гульнямі (футболам, валейболам, тэнісам і інш.).

Ал. КУЛЬГА

АБАВЯЗАК ГРАМАДЗЯНІНА

Паволі падымаецца вялікае зарава залатога сонца з-за шырокай зялёнай раўніны і пасылае свае жаўтавата-чырвоныя прамені праз зялёную сцяну бярозавых і асінавых лясоў у вялікія вокны белай будкі чыгуначніка.

Была шостая гадзіна раніцы. І шэры туман, што раней засланяў усю зямлю, зараз сабраўся ў доўгую паласу каля невялікага балотца і, паступова падымаючыся ў гару, рассейваецца маленькім ласкавым ветрыкам.

Раптам адчыніліся дзверы і на высокі дашчаны ганак выйшла жанчына сярэдняга росту, у чорнай доўгай спадніцы і шэрым кафтане, а на плячах, абкручваючы белую шыю, ляжала хустка жоўтага колеру з чырвонымі дробнымі кветкамі. На выгляд ёй можна было даць не больш як год сорак. Чорныя валасы, якія былі крыху закручаны і вельмі старанна расчэсаны, і шэрыя вочы, у якіх зіхацелі іскаркі радаснага жыцця, надавалі ёй вельмі прыемны выгляд.

Яна несла ў правай руцэ даёнку і накіравалася ў хлеў адкуль даносілася шорханне і цяжкое сапенне каровы.

— Ну, уставай, Красуня, — пачуўся тонкі і мілагучны голас жанчыны і з хлева пачалі даносіцца роўныя і доўгія гукі: — Цур-р-лой! Цур-р-лой! Гэта белымі густымі струменькамі білася малако аб сценкі даёнкі.

Потым жанчына выйшла з хлева, несучы ўжо поўную даёнку цёплага свежага малака, якое пенілася і астывала ад вільготнага паветра. Яна пайшла ў будку. А праз хвіліну адтуль пачалі даносіцца словы гэтай жанчыны — яна будзіла свайго сына:

— Апанаська, Апанаська уставай сынок! Шэсць гадзін ужо. Кароўку трэба ў поле гнаць. Няхай ходзе з расой.

— М-м-м, — прамармытаў Апанаська, паварачваючыся з боку на бок.

— Уставай! — праказала маці і сама выйшла на кухню рыхтаваць сыну снеданне.

Апанаська прачнуўся і пазяхнуўшы пачаў апранацца. Вярнулася маці, трымаючы невялікую клуначку з ядой, у якой была бутэлька малака, скварачка сала і некалькі пшанічных піражкоў.

— На вось, вазьмі, — перадаючы сыну клуначку з ядой, праказала маці,— а то мне няма часу, трэба хутчэй малако прадаваць.

— А дзе мой гальштук? — запытаў Апанаська сонным голасам.

— Гальштук?—перапытала маці, абводзячы ласкавым позіркам кватэру,— вось ён.

І яна, хутка падышоўшы да сцяны, дзе на цвіку вісеў чырвоны піонерскі гальштук, зняла яго і падала сыну,—на, вазьмі.

Апанаська ўзяў гальштук і клуначку з ядой і вышаў на двор.

Ласкавае сонца, што паспела ўжо аддаліцца ад зямлі, асляпляла сваімі праменнямі блакітныя вочы хлопчыка і абдавала сваім залацістым святлом яго белы твар. Ён хутка насунуў на вочы шэрую шапку, крыху згорбіўся і, саскокнуўшы з высокага драўлянага ганку, пабег да хлева, адчыніў дзверы і на двор выйшла вялікая бурая карова, якой як быццам не вельмі хацелася спяшацца на пашу і мала цікавіла яе густая і сакавітая трава, бо яна паволі перастаўляла свае ногі і час-ад-часу выгіналася.

Доўгі цубел Апанаські зараз-жа вывеў яе са стану сапліасці і прывёў у больш рухавы выгляд. Яна хутка падняла сваю галаву з поўкруглымі прыгожымі рагамі, шлёпнула некалькі разоў аб бакі сваім доўгім хвастом і весела пабегла праз двор на поплаў.

Апанаська ішоў ззаду не спяшаючыся і круціў лазовым дубцом у паветры. Уся прырода, што акружала яго з усіх бакоў, утварала вельмі прыемны малюнак. І кветкі, і сонца, і лес на адлегласці метраў чатырыста, а бліжэй на поўдзень балота, зарослае кусцікамі і высокай зялёнай асакой, пасярод якога павольна расходжваў даўганосы бусел у чырвоных ботах, пільна ўглядваючыся ў траву, шукаючы лягушак, і тоненькае гудзенне пчол, і басавыя ўторы шаршнёў, збіраючых пылок з кветак, і вясёлыя песні птушак, і маторнае гудзенне майскіх жукоў, — усё гэта зліваліся ў адзіны бясконцы гул працы і жыцця. Дайшоўшы да невялікай купіны Апанаська спыніўся, сеў, і дастаўшы з правай кішэні сваёй старой курткі маленькую кніжачку, прыняўся чытаць.

Недалёка ад таго месца, дзе сядзеў ён, ішла чыгунка і рэльсы асляпляюча блішчэлі на сонцы, іскацелі срэбрам. Была сёмая гадзіна раніцы. З-за лесу даляцеў доўгі і моцны гудок паравоза, а хвіліну пачакаўшы пачулася шыпенне і пыхценне цягніка.

— Гэта — скоры, — падымаючыся з купіны, праказаў уголас Апанаська, здымаючы з плячэй куртачку і кладучы на тое месца, дзе сядзеў.

— Хутка сем гадзін, — а з поўхвіліны памаўчаўшы ён дадаў: — крыху спазняецца.

У гэты час гудок пачуўся ўжо зусім блізка. Нават чутны былі роўныя ўдары калёс аб стыкі рэльсаў пачалі даносіцца выразна, нібы цоканне вялікага гадзінніка на сцяне. Яшчэ хвіліна, і чорныя клубы дыму паказаліся над самай ускраінай лесу, а потым выскачыў з-за лесу і сам цягнік.

— Ой! — усклікнуў Апанаська схапіўшыся за галаву, — пажар!

І доўга не марудзячы, сарваў з шыі чырвоны гальштук, кінуўся бегчы да палатна чыгункі, махаючы ім угары.

— Стой, стой!! — крычаў ён цягніку, які хутка імчаўся, а ззаду трэцяга вагона ад заду вырываліся клубы белага полымя і сваімі жоўтымі языкамі аблізвалі ўвесь ніз вагона. Штось грукнула і так моцна, нібы выпалілі з трохдзюймовай гарматы над самым вухам, пасля заавінела і вагон пачаў падскакваць на рэльсах. Гэта трэснула рэсора і адламаны кавалак адляцеў у бок, рассякаючы паветра.

— Крушэнне! — вырвалася з грудзей Апанаські, і сабраўшы апошнія сілы ён зрабіў яшчэ некалькі кругоў чырвоным гальштукам над галавой. Пасля пахіснуўся, закрыў твар трымцячымі рукамі і паваліўся ніц на галічнік каля самых калёс цягніка, працадзіўшы праз зубы: — Сто-о-й!

Галоўны праваднік, які праходзіў у гэты час праз тамбур з аднаго вагона ў другі, заўважыў, што нехта, махнуўшы чырвоным сцяжком, паваліўся. І, доўга не разважаючы, зараз-жа пабег у другі вагон, схапіўся за ручку тормаза «стоп» і павярнуў яе да сябе. Цягнік стаў.

Ён выглянуў з вагона і ў гэты час яго абдала чорным удушлівым дымам, а пасля шуганула чырвоным полымем.

— Пажар! — крыкнуў ён, саскочыўшы на зямлю, і было кінуўся бегчы да паравоза. Але зоркае вока старога машыніста ўжо даўно заўважыла небяспеку, раней чым магчыма было яго паведаміць.

Хутка раскручваўся пажарны рукаў і крышталёвыя струменькі халоднай вады забарабанілі па вагону, ліквідуючы полымя.

Прайшло хвіліны дзве, і замест чорнага дыму і полымя клубіўся шэры пар.

Пажар быў ліквідаваны.

— Ох, як мы шчаслівы, што нас спынілі. Яшчэ хвіліна — і крушэнне, — праказаў ўсхваляваны праваднік, выціраючы потны твар рукавом сваёй курткі.

Але ў гэты час Апанаська ачухаўся і падняўшы галаву ўбачыў, што цягнік спынен, вакол яго сабралася некалькі чалавек і ўсе глядзяць на яго.

— Што гэта? — запытаў ён сябе, але тут-жа мільганула — пажар. І, хутка ўскочыўшы на ногі было кінуўся бегчы.

— Вы куды? — запытаў галоўны праваднік, схапіўшы яго за плячо.

— Там вагон гарыць. Спасаць!—закрычаў ён, вырываючыся ад яго.

— Вы супакойцеся, таварыш, пажар ужо ліквідаваны і дазвольце вам шчыра падзякаваць за вашу вялікую паслугу. Калі-б не вы — было-б крушэнне.

— Я... я гэта выканаў ні што іншае, як абавязак совецкага грамадзяніна.— адказаў Апанаська спакойным і ўпэўненым голасам, хоць у самога ўсё яшчэ сэрца біла трывогу.

— Вы выканалі вельмі вялікую справу, — гаворачы гэтыя словы, галоўны праваднік моцна абняў Апанаську і пацалаваў. — Скажыце калі ласка, які нумар вашай будкі і ваша прозвішча? Я аб гэтым хачу далажыць начальніку дарогі.

— 242. Апанас Мікалаевіч Байкоў— адказаў Апанаська, усміхаючыся.

У гэты час вырваўся зароў гудок паравоза і цягнік ціхай хадой рушыў да бліжэйшай станцыі.

— Ну, бывайце... — сказаў галоўны праваднік. Ён ускочыў на падножку вагона, выцягнуўся ў струнку і прыклаў правую руку да галаўнога ўбору.

— Шчасліва! — адказаў Апанаська, зрабіўшы піонерскі салют і з радаснай усмешкай праводзіў цягнік у далейшы шлях.

ДА ЮБІЛЕЮ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА



Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

★ ★ ★

У сёнешнім нумары мы друкуем творы вялікага ўкраінскага кабзара Тараса Грыгор'евіча Шаўчэнка, напісаныя ім у Орскай крэпасці і Кос-Арале ў 1847—1848 гг., у перакладзе **Пятра Глебкі.**

Т. Г. Шэўчэнка

**

Привикне, кажуть, собака за возом
бигти, то біжить і за саньми

Вось так і я цяпер пішу:
Паперу толькі марна трачу...
Было-ж! Дальбог-жа, не брашу!
Успомню што, ці што пабачу,
Дык так утну, ажно заплачу,
Як быццам сам пералячу
Хоць на галзіну на Украіну,
І толькі гляну на зямлю,
Нібы дабро каму зраблю,
Так люба сэрца адпачыне.

Калі-б сказаць, што не люблю,
Што я Украіну забываю,
Або здрадлівых праклінаю
За тое, што цяпер цярплю —
Дальбог, браточкі, прабачаю
І літасцівага малю,
Каб вы не ўспомнілі чым кепскім;
Хоць я вам крыўды не рабіў,
Ды ўсё-ж такі між вамі жыў,
Дык можа што і засталося.

Орская крэпасць, 1847 г.

**

Ану ізноўку вершаваць!
Цішком вядома! Ну, нанова
Пакуль навінка на аснове,
Старызну бога ліцаваць,
А гэта... як-бы вам сказаць,
Каб не збрахаўшы? Ну нанова
Людзей і долю праклінаць!
Люд за тое, каб нас знаці
Ды нас шанавалі; —
Долю нашу, каб не спала,
Ды нас даглядала.
А то, бач, што нарабіла:
Кінула малога
У раздарожжы, і не дбае...
А яно, нябога,
Сівавусае, малое —

Дзіцянё, вядома! —
І падыбала пацішу
Спежкай незнаёмай
Аж за Урал. У пустыні
Прыстала ў няволі...
Як-жа цябе не праклясці,
Здрадлівая доля?
Не выкляну-ж цябе, доля,
А буду хавацца
За валамі, і пацішу
Вершамі займацца,
Сумаваць і спадзявацца
Што ў госці ў няволю
З-за Дняпра ты шырокага
Прыдзеш, мая доля.

Орская крэпасць, 1848 г.

**

Ой гляну я, падзіўлюся
На той стэп, на поле:
Ці не дасць бог літасцівы
Хоць на старасць волі?
Пайшоў-бы я на Украіну,
Пайшоў-бы дадому:
Там-бы мяне прывіталі,
Радыя старому;
Там-бы я спачыў хоць трохі
Молячыся богу:
Там-бы я... Ды шкода й думкі,
Не будзе нічога.
Як-жа-ж гэта у няволі
Жыць без надзеі?
Людзі добрыя, навучыце,
А то адурэю!

Орская крэпасць, 1848.

**

Ды не дай ты, бог, нікому
Так, як мне цяпер, старому,
У няволі прападаці,
Свае годы марнаваці.
Ой пайду я лугам-полем
Ды развею смутак болі...
«Дзе там! З гэтай хаты, — баюць, —
Пагуляць не выпускаюць!»

Кос-Арал. 1848.

**

Дабро, хто мае сам хаціну,
А ў той хаціне ёсць сястра,
Ці маці добрая! Дабра,
Дабра такога і ў паміне
У мяне ад роду не было
А так сабе жыццё ішло...

І давялося неяк мне
У чужой далёкай старане
Заплакаць, што няма радзіны,
Няма прыстанішча, хаціны!

Мы доўга ў моры прападалі;
Прышлі ў Дар'ю на якар сталі;
З ватагі пісьмы падалі,
І ўсе пацішу зачыталі.
А мы з калегам прыляглі
Ды штось такое размаўлялі.
Я думаў: дзе-б таго дабра,
Пісьмо ці маці ўзяць на свеце?
«А ты, брат, маеш?» — «Жонка й дзеці,
І дом, і маці, і сястра!
А пісьма няма...» —

Кос-Арал. 1848.

**

Ну, што-б здаецца, словы-сказ?!
Размова, голас — больш нічога!
А сэрца ажывае ўраз,
Як іх пачуе!. Знаць, ад бога
І голас той і словы-сказ
Ідуць у людзі!..

Я схіліўся,
Не то, каб вельмі зажурыўся,
А так на палубе стаяў
І сторч на мора пагладаў,
Нібы на Юду. А з туману,
Як кажуць, стала выглядаць
Чырвонатварая Дыяна..
А я ўжо думаў легчы спаць,
Ды й стаў каб глянуць-падзівіцца
На круглы воблік маладзіцы,
Ці праўда — дзеўчыны!. Матрос,
Такі зямляк наш, з Астраўное,¹)
Ад вахты тое
Ці так сабе, нудзіўся штось;
Ды й заспяваў—вядома ціха,
Каб капітан не чуў; бо ліха,
Якісь благі, хоць і зямляк.
Пяе матрос, як той казак,
Што ў наймах вырас сіратою,
Ідзе служыць у маскалі...
Даўно, даўно калісь
Я чуў, як стаўшы пад вярбою
Пацішу дзеўчына спявала;
І шкода мне малому стала
Таго нябогі-сіраты.
«Што ён утаміўся,
На тын пахіліўся, —
Людзі кажуць і гавораць:
Мабыць, ён упіўся».
І я заплакаў: так малому
Было мне шкода сіраты.
Чаго-ж цяпер заплакаў ты?
Чаго цяпер табе старому
Душу ў няволі ціснe жаль?
Што свет завязаны, закрыты?
Што сам ты ёсць цяпер маскаль?
Што сэрца зранена, пабіта?
І што харошае наўсцяж
З яго дарэмна разлілося?
Што вось як жыць давялося?
Ці так, саколіку! — Ага-ж!

Кос-Арал. 1848.

¹) Астраўное—Арэнбургскай губерні



НА ЗДЫМКУ: хата Ярыны Ларчанка дзе Т. Г. ШЭЎЧЭНКА навучаўся грамаце ў дзяка Кацюбінскага ў 1822 — 23 гадах.

ЛІТАРАТУРНЫ КАЛЕНДАР

Праспер Мерымэ

(Да 135-годдзя з дня нараджэння)

Сёння споўнілася 135 год з дня нараджэння французскага пісьменніка Праспера Мерымэ.

Ен нарадзіўся ў дробнабуржуазнай сям'і. Бацькі яго былі мастакамі. Мерымэ атрымаў выдатнае выхаванне, свабоднае ад пагубнага ўплыву рэлігіі. Потым ён скончыў юрыдычны факультэт у Парыжы.



Мерымэ — адна з вялікіх цікавых з'яў французскай літаратуры прайшоўшага стагоддзя. Свядомае жыццё яго пачалося, калі ва Францыі, пасля гістарычных патрасенняў Вялікай Французскай буржуазнай рэвалюцыі і напалеонаўскіх войн, надышоў перыяд глыбокай рэакцыі.

У сваёй літаратурнай творчасці Мерымэ застаўся пісьменнікам буржуазным, ён быў блізка звязаны з пануючымі коламі пасля рэвалюцыйнай Францыі. Усё-такі Мерымэ — адзін з перадавых людзей свайго часу. У яго літаратурным абліччы ёсць рысы гістарычнай свежасці, якія робяць яго цікавым і для нас.

Для многіх сучаснікаў Мерымэ, як і для яго самога, незадаволенасць акружаючай рэчаіснасцю была адной з прычын, штурхаўшых іх шукаць творчага натхнення па-за межамі Францыі, у падзеях і людзях іншых краін і эпох. Многія творы Мерымэ пераносяць нас у Іспанію, якая стала другой духоўнай радзімай пісьменніка, ва ўсходнія і заакіянскія краіны. Цягаценне да іншакраінных сюжэтаў прыводзіла Мерымэ да доўгіх вандраванняў па рознастайных краінах, дзе ён вывучаў быт насельніцтва і культурныя помнікі данай краіны. Навуковыя інтарэсы Мерымэ знайшлі адлюстраванне і ў яго мастацкай творчасці.

Мерымэ — майстар апавядання і аповесці, якія адрозніваюцца высокай мастацкасцю. Свае антыклерыкальныя погляды Мерымэ выказаў у адной з ранніх работ — зборніку камедый «Тэатр Клары Газуль». Праз тры гады (1828) ён надрукаваў выдатную драму на тэму аб жорсткай барацьбе сярэдневяковых сялян супроць феадалаў-дваран — «Жакерыя».

Сярод іншых кніг Мерымэ трэба адзначыць «Таманго», «Узяцце рэдута», «Матэа Фалькане», «Каломба», «Ільская Венера».

Сусветнай славай карыстаецца аповесць Мерымэ «Кармен», якая зрабілася любімай чытанкай народных мас усіх краін. На аснове гэтай аповесці французскі кампазітар Бізэ стварыў бліскучы музыкальны твор — оперу «Кармен». Тэкст гэтай оперы, напісаны двума французскімі драматургамі, значна адрозніваецца ад сапраўднага тэксту Мерымэ.

Мерымэ адыграў дабратворную ролю ў культурных зносінах паміж французскім і рускім народамі. Ен ведаў рускую мову і мог непасрэдна знаёміцца з рускай літаратурай, падтрымліваючы жывую або пісьмовую сувязь з некаторымі з сучасных яму рускіх пісьменнікаў. Дзякуючы перакладам Мерымэ французскае грамадства атрымала магчымасць азнаёміцца з узорамі творчасці Пушкіна, Гогаля, Тургенева, Лермантава. У сваіх крытычных нарысах, прысвечаных рускай літаратуры і рускім пісьменнікам, Мерымэ спрабаваў даць характарыстыку развіцця рускай літаратуры і яе віднейшых прадстаўнікоў.

Вялікі рускі паэт А. С. Пушкін у прадмове да «Песень заходніх славян», якія ён у большай частцы пераклаў з Мерымэ, пісаў: «Мерымэ, востры і арыгінальны пісьменнік, аўтар «Тэатра Клары Газуль», «Хронікі часоў Карла IX», «Двайной памылкі» і іншых твораў надзвычай выдатных у глыбокім і зартым жалю заняпаду сёнешняй французскай літаратуры» (1835).

Сваімі творамі Мерымэ ўзбагаціў французскую і сусветную літаратуру. Створаныя ім узоры кароткай аповесці, насычанай унутранай страснасцю, расказанай у бліскучым стылі, не пакідаюць зачароўваць чытачоў усяго свету. У СССР кола чытачоў твораў Мерымэ ўсё больш пашыраецца. Асабліва любіць яго наша савецкая моладзь.

---o---

У ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА

Тэатр оперы і балета БССР рыхтуе да 20-годдзя ленінска-сталінскага камсамола оперу «Міхась Падгорны» (лібрэта П. Броўкі, музыка Цікоцкага) у канцэртным выкананні. 29 кастрычніка тэатр дасць канцэрт спецыяльна для моладзі сталіцы БССР.

Апрача таго тэатр рыхтуе вялікі канцэрт сіламі салістаў оперы і калектыва балета. У праграме канцэрта шмат новых песень, масавых і індывідуальных танцаў.

А. Маслоўскі

А. Н. РАДЗІШЧЭЎ

(Да 136-годдзя з дня смерці)

У гісторыі рускай літаратуры імя Александра Нікалаевіча Радзішчэва з'яўляецца адным з найбольш яркіх імён. У развіцці грамадскай думкі XVIII века гэты пісьменнік унёс дух рашучага пратэсту супроць самаўладства і жахаў прыгоннага права.

Скончыўшы пажаскі корпус, ён як найбольш здольны вучань, быў пасланы за граніцу, дзе шэсць гадоў займаўся ў Лейпцыгскім універсітэце. Екацярына II, пасылаючы Радзішчэва разам з групай іншых студэнтаў за граніцу, спадзявалася ў яго асобе атрымаць чалавека, «да службы палітычнай і грамадзянскай здольнага». У праграму заняткаў, якую распрацавала асабіста Екацярына II, уваходзіла вывучэнне «маральнай філасофіі, гісторыі, а больш за ўсё права натуральнага і ўсенароднага».

Дапытлівы розум А. Н. Радзішчэва не абмяжоўваўся догмамі вучобы, устаноўленымі яму Екацярынай II. З першых-жа дзён сваёй вучобы А. Н. Радзішчэў глыбока захапіўся пануючымі ў той час у Заходняй Еўропе перадавымі тэорыямі французскіх асветнікаў і матэрыялістаў Русо, Вольтэра, Гельвецыя, Гольбаха; Мантэск'е

Вывучаючы тэорыі вялікіх асветнікаў, прыглядаючыся да жыцця народа, Радзішчэў выхаваў у сабе глыбокую нянавісць да ўсяго таго, што робіць чалавека тупым і пакорным рабом, ён узненавідзеў насіцеляў гэтага рабства, дэспатаў-памешчыкаў. З гэтымі рэвалюцыйнымі поглядамі А. Н. Радзішчэў, пасля заканчэння вучобы, у 1772 годзе вяртаецца ў Расію.

Екацярына II, стараючыся перад усёй Еўропай прадставіць Расію як краіну, якая буйнымі крокамі ідзе да культуры, увяла працоўныя масы рускага народа ў стан жахлівага рабства і прыгнечання. Мільённыя масы сялянства ў Расіі знаходзіліся пад гнётам памешчыкаў, выміралі ад голаду і галечы, а прыбліжоныя Екацярыны II усялякі крычалі аб росквіце Расіі, выдаючы пацёмкінскія вёскі за сапраўднасць.

Незвычайнае самавольства, хабарніцтва, здзекі над народам і згубную паншчыну — вось што ўбачыў малады Радзішчэў па прыездзе ў Расію.

Сваю літаратурную дзейнасць А. Н. Радзішчэў пачаў з перакладаў.

Займаючыся перакладнай работай, А. Н. Радзішчэў выбіраў для перакладаў найбольш выдатныя творы



прагрэсіўнай заходне-еўрапейскай думкі. У 1773 годзе ён перакладае кнігу Маблі па гісторыі Грэцыі і ўжо ў гэтай першай сваёй працы ён не застаецца беспрыстрасным вучоным-перакладчыкам, а дае ў кнізе едкія, востра-палітычныя заўвагі і каментарыі.

Жыццю грэкаў у старадаўнасці, іх пастаяннаму імкненню да свабоды А. Н. Радзішчэў супроцьстаўляе становішча рускага працоўнага народа, надзеі якога аб свабодзе былі задаўлены самаўладствам. Слова «дэспатызм», якое сустракаецца ў кнізе, ён перакладае словам «самаўладства» і дае да яго востра-бічуючую заўвагу, накіраваную супроць царызма: «Самодержавство есть найпротивнейшее человеческому естеству состояние». У цэлым радзе іншых перакладаў А. Н. Радзішчэў смела выступае супроць цемры і невуцтва народжанага ўсім самаўладна-прыгонніцкім ладам тагочаснай Расіі.

Александр Нікалаевіч Радзішчэў не толькі адзначаў цяжкае жыццё рускага народа ва ўмовах самадзяржаўна-прыгонніцкай манархіі, але ён клікаў народ да барацьбы да паўстання супроць цара і яго прыспешнікаў. Прыглядаючыся да жыцця працоўнага народа, ён бачыў слёзы, чуў стогны прыгнечанага селяніна, а з другога боку наглядаў панства, раскошу вярхушкі грамадства, жывучага эксплаатацыяй.

У 1790 годзе выходзіць з друку яго «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву», дзе ён з усёй рашучасцю і вастрынёй выступае супроць панскага самавольства, супроць прыгнечання сялянства і гэтая кніга з'явілася абвінаваўчым актам супроць усёй сістэмы самаўладства. Напісаная ў выглядзе дзенніка, «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» заключае ў сабе цэлы рад найярчэйшых карцін, у якіх з гранічнай выразнасцю паказаны вобразы сялян галодных і ўбогіх, жанчын і дзяцей апухшых ад недаядання, паказана рэкрутчына — найстрашнейшы біч мінулай вёскі, калі кармілец сям'і ішоў на 25 год у салдаты. Гнеўнымі радкамі апісвае Радзішчэў сцэны збівання сялян памешчыкамі, насілле барчукоў над сялянскімі дзяўчатамі, публічны продаж сялян нараўне з сабакамі. Паказаўшы гэтыя карціны, А. Н. Радзішчэў усю сілу свайго пратэсту і абурэння накіроўвае па адрасу памешчыкаў-прыгоннікаў: «Звяры прагныя, піяўкі ненасытныя, што селяніну мы пакідаем. Тое, чаго адняць не можам — паветра. Да, адно паветра. Адымаем нярэдка ад яго не толькі дар зямлі — хлеб і ваду, але і самы свет».

Са старонак «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» ўстаюць перад намі вобразы абяздоленых і бедных сялян, над якімі пануе дэспатычнае самавольства памешчыкаў. Ужо ў адным з першых раздзелаў («Любань») у сваёй кнізе «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» А. Н. Радзішчэў расказвае аб сустрэчы памешчыка з селянінам, які скардзіцца яму на непасільную шасцідзённую паншчыну, якая дае магчымасць працаваць на сваёй раллі толькі па начах і святах.

У другім-жа раздзеле гэтай кнігі «Вышні Валачок» А. Н. Радзішчэў абвінавачвае памешчыка і звяртаецца з заклікам да помсты: «Сакрушыце прылады яго земляробства, спаліце яго гумны, асеці, жытніцы і развейце попел па нівах, на іх-жа адбываліся яго пакуты...». У адным з раздзелаў сваёй кнігі А. Н. Радзішчэў апісвае публічны продаж памешчыкамі сялян, укладваючы ў гэтую сцэну ўсю сілу сваёй нянавісці да эксплаататараў: «Стары, год 75, абапёршыся на вязавай дубінцы, прагне ўгадаць, каму лёс яго аддае ў рукі, хто закрые яго вочы».

Александр Нікалаевіч Радзішчэў устае ў гэтай кнізе перад намі як палітычны змагар, які стойка і пераконана выступаў супроць самаўладства і прыгонніцтва, супроць няроўнасці людзей. Радзішчэў узрываў асновы самаўладства і яго кніга «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» дае нагляднаы прыклад такой бічуючай крытыкі. Пісьменнік адзначаў: «З аднаго боку — амаль ўсемагутнасць, з другога — немач безабаронная. Гэта жрэбій зняволенага ў смуроднай цямніцы. Гэта жрэбій вала ў ярме». У процілегласць крыважэрным памешчыкам А. Н. Радзішчэў выводзіць вобразы сялян, паказваючы маральную перавагу іх над прыгоннікамі. З любоўю і пяшчотай ён гаворыць аб чэснасці, дабраце і вялікадушнасці простага рускага чалавека. Прагнасці, скупасці і крывадушнасці памешчыка-прыгонніка ён супроцьстаўляе чыстыя, нявінныя натуры сялянскіх дзяўчат і жанчын. Ярка выкрываючы характар кнігі і яе рэвалюцыйная накіраванасць напалохалі да шаленства самадзяржаўную кліку. Екацярына II, прачытаўшы «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву», убачыла ў ёй вастрэйшую зброю, падрываючую асновы яе ўлады ў гэты перыяд масавых народных паўстанняў. Яна заявіла, што «сачыніцель» кнігі А. Н. Радзішчэў «бунтаўшчык, небяспечней Пугачова», а ў тыя годы імя Пугачова, як правадыра сялянскага паўстання, было найбольш страшным для самаўладства.

За вострую крытыку і выкрыццё рускага самаўладства ў гэтай кнізе А. Н. Радзішчэў быў прыгавораны да кары смерцю, замененай яму 10-гадовай ссылкай у Сібір. Вярнуўшыся з ссылкі, зацкаваны і затаваны, пісьменнік, несупынна запужваемы новымі рэпрэсіямі, у 1802 годзе пакончыў сваё жыццё самагубствам.

Александр Нікалаевіч Радзішчэў верыў у творчыя сілы рускага народа, ён ведаў, што працоўны народ узнімецца супроць векавога рабства і скіне ярмо самаўладства, узняўшы сцяг свабоды. У сваёй одзе «Вольнасць» ён адкрыта клікаў да знішчэння царызма:

«Возникнет рать повсюду бранна,
Надежда всех вооружит;
В крови мучителя венчанно
Смыть свой стыд уж всяк спешит.
Меч остр, я зрю, везде сверкает,
В различных видах смерть летает
Над горлою главой царя.
Ликуйте склепанны народы.
Се право мщенное природы
На плаху возвело царя.
И мощи се завесу лживой
Со треском мощно разодрав,
Кичливой власти и строптивой
Огромный истукан, поправ,
Сковав сторучно исполина,
Влечет его как гражданина
К престолу, где народ воссел».

Ода «Вольнасць», побач з «Падарожжам з Пецербурга ў Маскву», з'явілася адным з самых смелых, моцных і выкрываўчых твораў у гісторыі рускай літаратуры. Екацярына II, прачытаўшы оду «Вольнасць», зрабіла свае заўвагі: «Ода зусім яўна і ясна бунтоўская, дзе царам пагражаецца плахай».

Па сіле сваёй рэвалюцыйнай накіраванасці ў той перыяд творы Радзішчэва не мелі сабе роўных і гэтым, па-сутнасці, тлумачыцца тое, што больш чым стагоддзе яго працы былі забаронены і разыходзіліся ў рукапісах.

Сацыяльныя праблемы, пастаўленыя А. Н. Радзішчэвым — абарона свабоды думкі, свабода слова — клікалі народныя масы да барацьбы з самаўладствам. І імя Радзішчэва ў гэтай сувязі прадстае перад намі як імя перадавога чалавека сваёй эпохі, палкага барацьбіта за вызваленне працоўных мас.

Вярнуўшыся пасля шматгадовай ссылкі з Сібіры, ён не здаваў сваёй зброі і прадставіў Александру I праект, патрабаваўшы вызвалення сялян і адмены прыгоннага права.

Чорная рэакцыя не зламала яго рэвалюцыйнай сілы, ён яшчэ з большым рвеннем уступіў у барацьбу супроць новых форм эксплаатацыі сялян. Ні ссылка ў Сібір, ні свавольле царскіх суддзяў не зламалі волю яркага барацьбіта з прыгонніцтвам, асудзіўшага яго на немінучую пагібель. У пісьме да сваіх сяброў, накіроўваючыся ў ссылку, ён гаворыць аб непахіснасці сваёй волі да барацьбы з царызмам:

«Ты хочешь знать: кто я, что я, куда я еду. —
Я тот же, что и был и буду весь мой век:
Не скот, не дерево, не раб, но человек».

Самаўладна-прыгонніцкі лад ненавідзеў Радзішчэва, песняра вольнасці і свабоды.

Найвялікшыя пісьменнікі Пушкін, паэты-дзекабрысты Чэрнышэўскі, Дабралюбаў, Некрасаў — выхоўваліся на творчасці Радзішчэва, яны вучыліся любіць радзіму, народ, яны вучыліся верыць у яго творчыя сілы, як яго любіў і верыў у яго А. Н. Радзішчэў. Уладзімір Ільіч Ленін у сваіх работах не раз гаварыў аб тым, што вялікі рускі народ стварыў, вылучыў з свайго асяроддзя сотні і тысячы барацьбітоў за вызваленне працоўных. У артыкуле, напісаным у 1914 годзе, гаворачы аб тым, што рускаму народу не варожа пачуццё нацыянальнай гордасці, ён пісаў: «Нам балючай за ўсё бачыць і адчуваць, якім насіллям, гнёту і здзекам падвяргаюць нашу, цудоўную радзіму царскія каты, дваране і капіталісты. Мы ганарымся тым, што гэтыя насіллі выклікалі адпор з нашага асяроддзя, з асяроддзя велікарусаў, што гэтае асяроддзе вылучыла Радзішчэва, дзекабрыстаў, рэвалюцыянераў-разначынцаў семідзесятых гадоў, што велікарускі рабочы клас стварыў у 1905 годзе магутную рэвалюцыйную партыю мас, што велікарускі мужык пачаў у той-жа час станавіцца дэмакратам, пачаў звяргаць папа і памешчыка» **(Ленін, т. XVIII, стар. 81).**

Зацкаваны царызмам, паміраючы Радзішчэў гаварыў: «Патомства за мяне адпомсціць».

Вялікі савецкі народ, выхаваны на лепшых традыцыях рэвалюцыйнай думкі, ніколі не забудзе ўсіх тых, хто сваімі пакутамі, сваім болем, сваёй барацьбой і сваімі ахвярамі падрыхтавалі «адраджэнне нашае да жыцця светлага, чалавечага» **(Горкі).**



НА РАДЗІМЕ Т. Г. ШЭУЧЭНКА У В. ШЭУЧЭНКАВА (КІЕУСКАЯ ВОБЛАСЦЬ).

НА ЗДЫМКУ: праўнук Т. Г. ШЭУЧЭНКА — шофер калгаса «Чырвоны партызан», прызыўнік Васілій ШЭУЧЭНКА.

НАПЯРЭДАДНІ 20-ГОДДЗЯ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАГА КОМСАМОЛА

П'ЕСЫ ДА 20-ГОДДЗЯ

МАСКВА. (Наш. кар.). Рад совецкіх драматургаў закончылі п'есы, прысвечаныя 20-годдзю ленінскага комсамола.

П'есу аб рабочым руху Закаўказзя пачатку 900-х гадоў «З іскры» напісаў драматург Дадзіані. Сталін, які выхоўвае кадры кіраўнікоў рабочага руху, арганізоўвае масы разрозненых царызмам нацыянальных атрадаў рабочага класа для барацьбы з самадзяржаўем, — у цэнтры п'есы.

П'еса заканчваецца першай сустрэчай Леніна і Сталіна.

П'еса Паустоўскага «Созвездие «Гончих псов» прысвечана рэспубліканскай Іспаніі, тым зменам у настроях інтэлігенцыі, якія адбываюцца пад уплывам падзей, гераічнай барацьбы іспанскага народа.

Высока ў гарах Іспаніі знаходзіцца французская абсерваторыя. Вучоныя заняты вырашэннем навуковых праблем. Грамадзянская барацьба ідзе там, далёка ўнізе. Але вучоныя не засталіся ў баку ад падзей. Астраномы аказалі дапамогу французскаму лётчыку, які разбіўся каля абсерваторыі. Лётчык памёр. Астраномам засталіся палкія пісьмы лётчыка аб барацьбе іспанскага народа. Вучоныя ўцягнуты ў барацьбу супроць варвараў-фашыстаў.

Тэме росту нашай моладзі прысвечана п'еса Арбузова «Таня». Таня—вузаўка з індывідуалістычнымі ўяўленнямі аб асабістым і грамадскім. Яна кідае вышэйшую ўстанову, бачачы сваё шчасце ў каханні да мужа.

Жыццё ў асяроддзі энтузіястаў краіны на Далёкім Усходзе, іх мужнасць, цяжкія жыццёвыя выпрабаванні штурхаюць Таню да правільнага разумення грамадскіх адносін.

«Тут многа сонца» — п'еса драматурга Гаробія, у якой аўтар расказвае аб жудасна-злачынных дзеяннях іспанскіх трацкістаў.

П'ЕСА АБ 1812 ГОДЗЕ

Драматург Вл. Салаўёў расказвае аб сваёй п'есе, прысвечанай падзеям 1812 года, наступнае:

— Галоўнымі героямі і асноўнымі персанажамі маёй п'есы аб 1812 годзе з'яўляюцца Кутузаў і Напалеон.

Вядучая інтрыга п'есы пабудавана на паводзінах у часе айчыннай вайны фельдмаршала рускіх войск Кутузава.

У п'есе паказаны партызанскі рух, пачаты Дзянісам Давыдавым, і патрыятычныя пачуцці рускага народа ў часе яго барацьбы з заваявальнікам.

У п'есе адлюстраван час ад уступлення Напалеона ў Вільна да смерці Кутузава ў Бунцлау.

ОПЕРА АБ ЧАПАЕВЕ

У тэатры імя К. С. Станіслаўскага рыхтуецца пастаноўка оперы «Чапаеў» кампазітара Б. Мокраусава па лібрэта С. Свірыдава.

Опера «Чапаеў» мала падобна на аднайменны фільм. У оперы Чапаеў выступае, як зусім склаўшыйся, народны палкаводзец. Цэнтральны эпізод оперы — узяцце Чапаевым разам з Фрунзе, па загаду Леніна, горада Уфы ў 1919 годзе.

Глядач убачыць на сцэне знаёмых герояў — камісара Фурманава, кулямётчыцу Анку, ардынарца Пецьку. У оперы ўведзены і новыя персанажы: старая-сялянка, якая ўступіла разам з сынам у атрад Чапаева; дачка кулака — Ольга Капэўнікава, якая прабралася па ўказанню белых да Чапаева (сапраўдная гістарычная фігура).

У музыцы оперы шырока выкарыстан багацейшы волжскі фальклор.

Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці

Па ініцыятыве Дома народнай творчасці БССР у Менску ў канцы кастрычніка будзе праведзена III усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці, прысвечаная XX гадавіне ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

У алімпіядзе прымуць удзел звыш двух тысяч чалавек, у тым ліку каля тысячы чалавек з раёнаў і абласцей БССР.

Для выяўлення і адбору лепшых сіл мастацкай самадзейнасці з 1 па 20 кастрычніка па рэспубліцы арганізуюцца раённыя алімпіяды, а з 21 па 25 кастрычніка — абласныя. У склад журы па адбору лепшых калектываў і салістаў увойдуць кваліфікаваныя работнікі прафесіянальнага мастацтва, прадстаўнікі Упраўлення па справах мастацтваў і Дома народнай творчасці, грамадскіх арганізацый і інш.

Значэнне надыходзячай алімпіяды вялікае. Яна, бясспрэчна, не толькі прадэманструе велізарныя дасягненні нашай шчаслівай совецкай моладзі ў народнай творчасці і самадзейным мастацтве, не толькі ярка ў мастацкіх вобразах адлюструе гарачую любоў маладых патрыётаў да сваёй мацеры-радзімы, іх беззаветную адданасць свайму народу, сваёй комуністычнай партыі і вялікаму правадыру таварышу Сталіну, але і паслужыць магутнай зарадкай для далейшага ўздыму народнай творчасці і мастацкай самадзейнасці, для арганізацыі вялікай сур'ёзнай зімовай вучобы.

Адначасова III усебеларуская алімпіяда з'явіцца падрыхтоўкай да двух важнейшых падзей, якія адбудуцца ў будучым годзе: адкрыццю Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі (на якой будуць шырока прадэманстраваны мастацкая самадзейнасць і творчасць народаў БССР) і дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

III усебеларуская алімпіяда дапаможа выявіць самае лепшае ў мастацкай самадзейнасці, што ёсць у нас, дапаможа вылучыць лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці, найбольш адораных, здольных спевакоў, танцораў, музыкантаў.

У адрозніванне ад іншых усебеларускіх алімпіяд, у III усебеларускай алімпіядзе прымуць удзел лепшыя драматычныя калектывы самадзейнага мастацтва. Яны не толькі прадэманструюць дасягненні самадзейнасці ў гэтым жанры, але і дапамогуць выявіць маладыя здольныя акторскія кадры, у якіх нашы тэатры маюць такую вялікую патрэбу.

Аб'ём і задачы III усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці вельмі вялікія. Часу засталося вельмі мала. Таму неабходна неадкладна разгарнуць шырокую падрыхтоўку да яе.

Комсамол, профсаюзы, органы Наркомасветы павінны актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку алімпіяды. Асаблівую ўвагу трэба аддаць арганізацыі калгасных калектываў самадзейнасці, падбору рэпертуара, палепшанню якасці выканання. Актыўны ўдзел у гэтым павінны прыняць у першую чаргу комсамольскія арганізацыі, настаўнікі, палітасветінспектары ў калгасах, сельсоветах і раёнах.


Конкурс на лепшы самадзейны калектыў, што зараз праводзіць Белрадыёкамітэт, павінен стаць неадрыўнай часткай падрыхтоўкі да III усебеларускай алімпіяды, прысвечанай такім двум важнейшым датам, як XX-годдзе ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

П.

КАРАГОДНАЯ ПЕСНЯ

Музыка Е. ТУРАНКОВА

Словы А. Астрэйка



Гэй, прытупну нагой
І ўпрысядку пайду,
А прытупну другой —
Кола-круг завяду.
Завяду кола-круг —
Шырыня ды прастор,
І паклічу падруг
Прыгажуняў сясцёр.

Іх багата ў мяне,
Я, сябры, не адна.
Усіх дзесяць сясцёр
Маладых, як вясна.
Запляту я ў касу
Стужку чырвань-агонь,
Усе дзесяць красунь
Пратанцуюць са мной.

Шырай круг, шырай круг,
Запявала, выходзь,
Славу сонцу-жыццю
Песняй звонкай заводзь!
Зашумі, маладосць,
Заскачы, загуляй,
Паглядзі на наш рост,
Родны сталінскі край!

АБ ЛІТСТАРОНКАХ ДВУХ ГАЗЕТ

За апошні час на старонках абласных і раённых газет Беларусі надрукавана шмат вершаў і апавяданняў пачынаючых аўтароў. З'ява вельмі ўцешная, але не заўсёды карысная. Калі верш ці апавяданне цікавыя, калі чытач, прачытаўшы іх, адчувае ў сабе нейкае задавальненне, вядома, што такія рэчы карысныя, і друкаваць іх, безумоўна, трэба. Але калі ад гэтых вершаў і апавяданняў вее пустэчай, калі яны, як кажуць, нічога не даюць «ні розуму, ні сэрцу»—дык ці варта іх друкаваць?

Для прыкладу возьмем некалькі літстаронак з газет «Большэвік Палесся» (Мазыр) і «Соцыялістычнае земляробства» (Капыль).

2 верасня г. г. газета «Большэвік Палесся» надрукавала некалькі вершаў пачынаючых аўтароў. Да лепшых твораў літстаронкі можна аднесці верш Бар. Глікіна «Палессе». Аўтар на фоне мінулага разгортвае карціну сучаснага жыцця Палесся, багацце калгаснікаў, рост прамысловасці, росквіт культуры, патрыятызм і любоў былых «палешукоў» да радзімы. У вершы ёсць шмат вельмі ўдалых радкоў, гаворачых аб здольнасці тав. Глікіна. Паэт усхваляваны новымі песнямі Палесся і ён пытаецца ў старога:

Скажи, разве песни,
подобные этой,
Певали народы,
знавали века?

Азначэнне назваў—Палессе, хлеб, жыццё, адукацыя народа пры царызме падана вельмі ярка і жыва. Напрыклад:

Чужую землю
орошаешь потом.
При этом
под панскую плеть ложись;
Каторжный труд,
и пинок за работу —
И это
носило название —
Жизнь.

Удала паказан маладым паэтам і лёс моладзі ў той час. Калі чытаеш, што бацькі толькі і ведалі «рожать дочерей для потехи пана, рожать сыновей для царя, для войны»,—адразу ўяўляеш усю карціну беспрасветнага рабскага жыцця, уяўляеш той час, калі званне «чалавек» было затаптана панамі ў гразь, а над ім панавала слова «жывёла».

Аб сучасным жыцці Палесся паэт з гордасцю і ўпэўненасцю заяўляе, што

Народ белорусский
семьей полноправной
Спокойно встречает
свой завтрашний день.

і што

... в жизни никто
никогда не посмеет
швырнуть, как плевок,
нам в глаза
— Полещук.

Недахопам гэтага верша з'яўляецца яго расцягнутасць і недапрацаванасць многіх мясцін. Напрыклад: «Омытое зорями свежей росы», ці «звеня переливами зрелых плодов». Як гэта? Плады не звіняць, а раса не падобна на зоры. Тут незразумелыя паэтычныя выкрунтасы, надуманасць і бессэнсоўнасць.

Да пасрэдных вершаў літстаронкі можна аднесці і верш Паўла Сіненка, напісаны на рускай мове. На жаль, не гледзячы на цікавы сюжэт, аўтар яго як след не вырашыў, а ў мове трапляецца шмат архаізмаў.

Калі гэтыя два вершы цікавыя, дык вершы І. Кажэмякі і Аўрамава зусім слабыя, маюць шмат надуманых, неадпавядаючых рэчы эпітэтаў і граматычных памылак, а часам напісаны звычайнай прозай, заключанай у рыфму.

Напрыклад у вершы І. Кажэмякі напісана:

Ветерок, полощущий **красиво**
Тысячи развешанных **флагов**.

або:

От морей холодных, до кавказских
кручей.

Вядома, што паласкаць «красиво» эпітэт дрэнны, а ў слове «флагов» націск падае на «а», а не на «о». Па-руску трэба было-б сказаць «круч», а не «кручей».

Есць шмат памылак і бессэнсоўнасці і ў вершы Аўрамава.

Напрыклад:

Над **табой** пралятаць буду **міма**.

Як гэта над табой і міма? Бессэнсоўнасць.

У абодвух вершах нічога падобнага на паэзію амаль няма: звычайныя газетныя радкі, зрыфмаваныя да таго-ж няўдала.

Вядома, што тут вінавата рэдакцыя, якая не прымусіла аўтароў дапрацаваць свае вершы, не ўказала на істотныя недахопы ў іх, а прыняла да друку.

Літстаронка газеты «Соцыялістычнае земляробства» складаецца з пяці вершаў. Лепшым з іх з'яўляецца верш Аляксея Коршака «Развітанне». Есць у ім і пачуцце, і лірычная цеплыня, і не дрэнны змест, але, на жаль, малады здольны паэт падышоў да справы несур'ёзна і верш атрымаўся некалькі легкавесным і штампаваным.

Верш Ізі Шульмана «Громко раздавалася» ніяк нельга назваць вершам. У ім няма ні паэзіі, ні зместу. Аўтар вельмі няўдала скарыстаў газетныя радкі, пераблытаў іх, абяскровіў і атрымалася бязглуздзіца. І калі ён выкрыквае «громко раздавайся, песня боевая»—гэта гучыць вельмі фальшыва, бо гэты ўсклік не апраўданы самім вершам.

Верш «На вылазку бандытаў» напісаны Мікалаем Гарбузом, спачатку якбышцам і не дрэнны. Але яго псуюць занадта празаічныя радкі, якія не толькі вырываюцца з агульнай кампазіцыі верша, але, як канцоўка, не выражаюць поўнасцю яго ідэю.

Два вершы В. Гаўрука, адзін на рускай, другі—на беларускай мове, настолькі слабыя, што нават здзіўляешся, як гэта рэдакцыя адважылася друкаваць іх.

Указаныя недахопы друкуемых літстаронак вядома не накіраваны супроць добрых пачынанняў газет, якія друкуюць творчасць пачынаючых аўтароў. Наадварот, гэтыя добрыя пачынанні трэба развіць, але не па-чыноўніцку. Моладзь, якая робіць першыя крокі ў літаратуру, адчувае патрэбу ў дапамозе, і задача рэдакцый дапамагчы ім, выхаваць іх, прывучыць сур'ёзна працаваць над творамі.

К. ЦІТОЎ.

К. ГУБАРЭВІЧ

Пісьменнік і сцэнарны аддзел

Ворагі, якія прабраліся да кіраўніцтва кіно, з усіх сіл імкнуліся расхістаць і канчаткова разваліць сцэнарную справу. Яны добра разумелі, што сцэнарый з'яўляецца галоўнейшай умовай поспеху і росту совецкай кінематаграфіі, што сцэнарый — гэта цэнтральны нерв усяго кіноарганізма. І калі паразіць гэты нерв, значыць паразіць увесь арганізм. Ворагі не маглі збіць з ног совецкую кінематаграфію, выхаваную партыяй і народам, але ў сцэнарнай справе іх дыверсія была самай актыўнай. Прычым гэта дыверсія маскіравалася танчэйшым і разам з тым наглым двурушніцтвам. На словах яны прызнавалі сцэнарый, як самастойны драматургічны твор, на справе-ж сцэнарый быў не больш як «поўфабрыкат», сыравіна, з якой майстры і падмайстры кінорамясла выкройвалі па свайму гледжанню плоскія, убогія кіностандарты.

На словах ворагі крычалі аб прыцягненні пісьменнікаў у кіно, а на справе палохалі іх «кіноспецыфікай», а заўтра-ж напускалі на іх зграю прагных «суаўтараў», якія залазілі сваімі бруднымі рукамі не толькі ў душу пісьменніка, але і ў кішэню. У рэзультаце многія пісьменнікі проста адхіснуліся ад кіно, не жадаючы быць прычынай і ўдзельнікам спекуляцыйных камбінацый, нічога агульнага не маючых з мастацтвам.

Публічна было не мала дадзена клятваў, дэкларацый і абяцанняў умацаваць сцэнарныя кадры, прыцягнуць маладыя творчыя сілы на гэты ўчастак, а на справе не было чалавека больш бяспраўнага і закінутага ў кінавытворчасці, чым сцэнарыст. Таму не толькі не было прытоку маладых кадраў, але і нешматлікія старыя кадры вымушаны былі пакінуць сцэнарную справу.

Пасля гэтага зядзіўна, што з года ў год над кіновытворчасцю страшэнным бічам вісеў штучна ствараемы сцэнарны «голад», штогод кіностудыі не выконвалі свайго нават заніжанага плана, на паліцах кіностудый складаліся забракаваныя карціны, пастаўленыя па антымастацкіх і проста палітычна шкодных сцэнарыях, на якія траціліся дзесяткі мільёнаў рублёў.

Ці варта гаварыць, наколькі быў жыццёва неабходны круты і рашучы пералом ва ўсёй рабоце совецкай кінематаграфіі. Гэты пералом быў вызначан у гістарычным рашэнні ўрада ад 23 сакавіка гэтага года па пытаннях палепшання работы кінематаграфіі. Адным з важнейшых палажэнняў гэтага рашэння было пытанне аб сцэнарыях. Урад сваім рашэннем вярнуў сцэнарыю яго згубленае значэнне на кіновытворчасці, зрабіўшы яго вядучым звяном у творчай дзейнасці совецкай кінематаграфіі.

Сцэнарый — аснова кіновытворчасці. Вось чаму кіраўніцтва совецкай кінематаграфіі пачынае зараз рашучую перабудову запушчанай, шкодніцка нададзенай сцэнарнай справы.

Асноўнай і рашаючай умовай гэтай перабудовы з'яўляецца правільная і сістэматычная арганізацыя пісьменнікаў і драматургаў вакол сцэнарнай творчасці. Інакш кажучы, на сцэнарную работу трэба прыцягнуць тых людзей, якім, больш чым каму, гэта работа ўласціва і арганічна. Сцэнарыі—самастойныя творы мастацтва, значыць пісаць іх павінны мастакі слова. Гэтую думку выказаў яшчэ А. М. Горкі ў гутарцы з кінаработнікамі. Але ворагі свядома не хацелі ажыццявіць простую і ясную думку вялікага пісьменніка. Цяпер яна павінна стаць кіруючым напрамкам у перабудове кіноработы.

Амаль усе кіностудыі пачалі сваю перабудову з таго, што разгарнулі шырокі заклік пісьменнікаў у кіно. Камітэт па справах кінематаграфіі прыцягнуў вельмі значную частку пісьменнікаў да ўдзелу ў конкурсе на сцэнарыі. Толькі беларуская кіностудыя да апошняга часу з'яўлялася выключэннем. Ніколі ёй не ўдавалася наладзіць сумесную работу з нашай пісьменніцкай грамадскасцю. Гэта ёсць старая зацяглая хвароба, ад якой кіностудыя не можа пазбавіцца з самага пачатку свайго існавання. Зразумела, што ў сёнешніх умовах далейшая зацяжка гэтакай хваробы перайшла-б у прамое злачынства. Але за апошні час усё-ж заўважаюцца некаторыя адзнакі пералому. Рад буйнейшых беларускіх совецкіх пісьменнікаў пачалі сцэнарную работу для кіностудыі над актуальнейшымі тэмамі. М. Лынькоў, К. Чорны, М. Клімковіч пішуць сцэнарыі аб творчай рабоце геніяльнага Сталіна па стварэнню беларускай дзяржаўнасці. К. Крапіва прыступае да работы над камедыйным сцэнарыем аб прыстасоўніцтве і кар'ерызме. Я. Купала даў згоду напісаць сцэнарый па матэрыялу сваёй паэмы «Над ракой Арэсай». Есць дамоўленасць з Я. Коласам на напісанне сцэнарыя на матэрыяле сёнешняга калгаснага жыцця. З. Бядуля прыступае да работы над сцэнарыем, які пакажа багацце калгаснага заможнага жыцця. Э. Самуйлёнак піша сцэнарый аб пагранічніках. На гэтую-ж тэму, але зусім у другім плане, мяркуе стварыць сцэнарый І. Шапавалаў. Я. Маўр бярэ для напісання сцэнарыя цікавую тэму з жыцця нашай моладзі. Намечана арганізацыя маладзёжнай аўтарскай брыгады, якая напіша сцэнарый на матэрыяле жыцця і работы стаханаўцаў беларускіх заводаў і фабрык.

Гэты спісак будзе папаўняцца па меры далейшага прыцягнення беларускіх пісьменнікаў за сцэнарнай работы. Але ўжо можна гаварыць аб знамянальным і бадай першым зруху ў наладжанні творчай работы беларускіх пісьменнікаў з кіностудыяй.

Цяпер небяспечней за ўсё самаабман і заспакоенасць. Трэба ведаць, што папярэднія дамоўленасць з пісьменнікамі, нават пры ўмове іх шчырага і гарачага жадання працаваць над сцэнарыямі, ёсць толькі першы і не ва ўсіх выпадках рашаючы крок. Раней гэты крок звычайна быў першым і апошнім. З пісьменнікам дагаварваліся, заключалі дагавор і ўся творчая дапамога студыі на гэтым спынялася. Рэзультаты гэтай злачыннай практыкі цяжка адбіліся і на студыі і на аўтарах. Сцэнарны партфель студыі ўзбагачаўся аматарскімі практыкаваннямі, нічога агульнага з сцэнарыямі не маючымі, аўтары-ж расчароўваліся ў спробах навучыцца ствараць каштоўны кінематаграфічны твор.

І вось іменна цяпер кіностудыі неабходна суміраваць і ўлічыць увесь мінулы вопыт ганебных памылак і провалаў у рабоце з пісьменнікамі, каб не паўтарыць іх. У сувязі з гэтым неабходна вельмі патрабавальна гаварыць аб карэннай перабудове сцэнарнага аддзела студыі. Да гэтага часу гэты аддзел працаваў выключна дрэнна і, вядома, ні ў якой меры не адпавядаў свайму прызначэнню. Укамплектаваны ён быў выпадковымі людзьмі, якія маюць далёкія і цьмяныя разуменні аб сцэнарнай творчасці. Ніякай канкрэтнай творчай дапамогі аўтару з боку такога аддзела нельга было чакаць. Рэзультат яго «работы» —тое, што ў сцэнарным партфелі студыі ёсць тры—чатыры сцэнарныя прымітывы, не маючыя ніякай перспектывы дайсці да экрана. Сцэнарны аддзел быў адарван ад сваёй асноўнай пісьменніцкай базы, ад беларускай рэчаіснасці і літаратуры. Справа тут не ў тэрытарыяльнай адарванасці, а ў адсутнасці жывой і плённай сувязі.

Зараз кіностудыя пераводзіць свой сцэнарны аддзел у Менск. Мерапрыемства вельмі каштоўнае, хоць і спазнілася яно амаль на пятнаццаць год, таму што такі сцэнарны аддзел трэба было арганізаваць у БССР з самага першага дня існавання беларускай кінематаграфіі. Але і ў Менску гэты аддзел можа лёгка ператварыцца ў чыноўніцкую кантору па рэгістрацыі заключаных і скасаваных дагавораў, калі яго не зробіць сапраўднай творчай лабараторыяй. Ён павінен стаць тым творчым цэнтрам, дзе кожны аўтар зможа атрымаць дзелавую творчую дапамогу і разумную прынцыповую крытыку сваёй работы. Толькі пры гэтай умове сцэнарны аддзел стане сапраўдным арганізатарам творчых сіл БССР. Але самая, бадай, галоўная задача сцэнарнага аддзела заключаецца ў тым, каб разгарнуць глыбокую выхаваўчую работу. Цяжка зараз прадугледзець усе формы і метады гэтай работы. Напрыклад, будзе важна і практычна каштоўна дапамагчы аўтарам зразумець асноўныя законы кіномастацтва. Яны нічога агульнага, вядома, не маюць з праславутай «спецыфікай», якой так часта палохалі пісьменнікаў, але кіномастацтва, як і кожны від мастацтва, мае свае законы і не ўлічваць іх нельга. У гэтай галіне работы можна выкарыстаць самыя разнастайныя формы. Лекцыі, гутаркі, глыбокі кваліфікаваны разбор лепшых сцэнарных узораў саюзнай кінематаграфіі і сваёй работы (для чаго, дарэчы, трэба арганізаваць сцэнарную бібліятэку, дзе будуць збірацца сцэнарыі ўсіх кіностудый і кіналітаратура) рэгулярныя прагляды кожнай новай карціны з абавязковым яе аналізам, творчыя дыскусіі ў друку па сцэнарыях беларускіх пісьменнікаў і т. д.

Асаблівае месца і значэнне павінна заняць работа па выхаванню маладых сцэнарыстаў. Гэта работа найбольш складаная і не менш ганаровая. Сцэнарная творчасць маладых аўтароў сёння больш за ўсё неарганізавана. А колькі можна сярод іх знайсці сапраўды таленавітых аўтароў, калі ўмела арганізаваць іх і працаваць з імі! Гэта работа павінна быць ускладзена на сцэнарны аддзел. І поспех работы сцэнарнага аддзела будзе залежаць ад таго, як ён разгорне работу па выхаванню сцэнарнай моладзі.

Трэба спадзявацца, што пры дапамозе саюза пісьменнікаў БССР і яго крытычнай секцыі ўдасца разгарнуць патрэбную і плённую работу сцэнарнага аддзела ў Менску.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрэс рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Ул. Галоўлітбела № К—5664.